СОНЦА:
Усход, захад, даўжыня дня:
Мінск — 4.58, 21.14, 16.16.
Віцебск — 4.41, 21.11, 16.30.
Магілёў — 4.47, 21.03, 16.16.
Гомель — 4.51, 20.55, 16.04.
Гродна — 5.13, 21.30, 16.17.
Брэст — 5.23, 21.21, 15.58.

МЕСЯЦ:
Поўня 16 мая.

ІМЯНІНЫ:
Іавана Багаслова, Арсена, Пімена;
Віктара, Крыспіна.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 50 кап.

21 МАЯ 1992 г.
чацвер, № 100 (21878)

ВОЗГАЛАС

РЭФЕРЭНДУМ БУДЗЕ, АЛЕ НЕ ХУТКА

Як мы паведамлялі ўжо, 19 мая ў Мінску прайшла сустрэча групы прадстаўнікоў Савета Еўропы з дэлегацыямі краін СНД. Выступаючы на ёй, Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі С. Шушкевіч заявіў, што рэферэндум у рэспубліцы адбудзецца, але спачатку трэба прыняць новую Канстытуцыю і Закон аб выбарах. Разам з тым, адзначыў Шушкевіч, было б пажадана ўключыць у бюлетэні і пытанне аб мэтазгоднасці ўвядзення ў рэспубліцы пасады прэзідэнта.

ЗАЎТРА ПРАЧНЁМСЯ, А Ў НАС...

З крыніц, блізкіх да кіраўніцтва Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, стала вядома, што банк мае намер паскорыць тэрміны ўвядзення новых беларускіх грошай. Ранейшы тэрмін іх увядзення — 1 чэрвеня 1992 года, можа быць апярэджаны. Цяпер больш мэтазгоднай лічыцца ідэя закончыць абмен ўсіх старых грошай на новыя да 1 чэрвеня 1992 года. Такім чынам, з дня ў дзень можна чакаць «сюрпрызу» ад ўрада і Нацыянальнага банка. У самім банку такую спешку тлумачаць вельмі вялікім дэфіцытам наяўных грошай — няма чым плаціць зарплату, бо ў Мінск з Расіі прыбывае толькі пятая частка патрэбных для гэтага грошай.

Пытанні важныя, дзяржаўныя

З ПАСЯДЖЭННЯ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

На чарговым пасяджэнні Прэзідыума, якое вёў Станіслаў Шушкевіч, разгледжана пытанне аб практыцы пазбаўлення дэпутацкай недатыкальнасці народных дэпутатаў мясцовых Саветаў у сувязі з учыненнем імі парушэнняў.

У запісцы Генеральнага пракурора Рэспублікі Беларусь Мікалая Ігнатовіча робіцца аналіз статыстычных даных апошніх гадоў. Ён сведчыць аб тым, што некаторыя дэпутаты «не выконваюць ускладзеныя на іх выбаршчыкамі абавязкі і ўчыняюць злачынствы. Толькі ў 1991 годзе ў рэспубліцы ўчынілі злачынствы 44 дэпутаты гарадскіх, раённых, пасялковых і сельскіх Саветаў народных дэпутатаў... У 1991 годзе да крымінальнай адказнасці прыцягнута і асуджана 8 чалавек. Саветамі не дадзена згода на прыцягненне да крымінальнай адказнасці 24 дэпутатаў. Праваахоўнымі органамі на розных падставах справы адносна 4 дэпутатаў спынены і на цяперашні час 8 спраў знаходзіцца ў вядзенні».

Члены Прэзідыума заслухалі таксама інфармацыю першага намесніка Генеральнага пракурора Уладзіміра Кандрацьева.

...У час незаконнага палявання застрэлены лось... У калгасе ўчынены крадзеж паліўнай помпы... З фермы выкрадзена цяля... У выніку дарожна-транспартнага здарэння прычынены цялесныя пашкоджанні... Неаднаразова затрымліваўся за кіраванне аўтатранспартным сродкам у нецвярозым стане... Называюцца новыя прыкрыя факты, да якіх маюць, мякка кажучы, непасрэднае дачыненне асобныя дэпутаты. Так, называюцца і прозвішчы. Але... справа «спынена», «спынена», «спынена»... Бо, як правіла, Саветам народных дэпутатаў не была дадзена згода на прыцягненне дэпутата-парушальніка закона да крымінальнай адказнасці. Матывы тут розныя. Ну, напрыклад, такія: «па матывах дадаткай характарыстыкі і кампенсацыі ўрону», «учыненне злачынства адбылося па прычыне неабдуманасці таго, што за гэтым адбудзецца»...

Падкрэслівалася, што мясцовыя Саветы ў большасці выпадкаў беспадстаўна адхіляюць прадстаўленні пракураў у дачы згоды на прыцягненне да крымінальнай адказнасці дэпутатаў. Рашэнні па гэтых пытаннях, як правіла, нічым не матывуюцца або ў іх указваецца на немэтазгоднасць прыцягнення дэпутатаў да адказнасці. У асяроддзі дэпутатаў іншым разам пануе кругавая парука.

У прынятай пастанове акрэслена, на што павінны звярнуць увагу і чым кіравацца ў рабоце мясцовыя Саветы, Генеральны пракурор рэспублікі, ніжэйстаячыя пракуроры, Камісіі Вярхоўнага Савета па дзяржаўнаму кіраўніцтву, па пытаннях нацыянальнай бяспекі, абароны і барацьбы са злачыннасцю.

Дарэчы, гэта пастанова будзе надрукавана ў «Народнай газеце». Намесніку Генеральнага пракурора рэспублікі рэкамендавана выступіць таксама ў друку з адпаведнай інфармацыяй. Але тут ёсць адно далікатнае пытанне, на якім завастрыў увагу Старшыня Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь Уладзімір Каравай: аб учынках асобных дэпутатаў будзе гаварыцца як аб фактах злачынства. Але ж злачынцам чалавека можа прызнаць толькі суд...

Было над чым падумаць членам Прэзідыума і пры абмеркаванні пытання аб недахопах у арганізацыі парадку выезду грамадзян з Рэспублікі Беларусь і ўезду замежных грамадзян у яе. Ні для каго не з'яўляецца сакрэтам, што, напрыклад, на памежных пераходах у Брэсцкай вобласці вось ужо працяглы час існуе вельмі складаная абстаноўка. Перад мытнямі «Варшаўскі мост», «Казловічы» ўтвараюцца шматкіламетровыя чэргі транспартных сродкаў, тысячы людзей па пяць і болей сутак чакаюць магчымасці пераехаць дзяржаўную мяжу. Маюць месца факты спекуляцыі чаргой, злоўжыванні службовым становішчам.

Складаным застаецца і парадак атрымання візы на ўезд у Беларусь для замежных дзелавых людзей і грамадзян, якія суправаджаюць гуманітарныя грузы.

Старшыня Камісіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і знешнеэканамічных сувязях Пётр Садоўскі, здаецца, акрэсліў галоўныя прычыны такога становішча. Гэта і абмежаваныя магчымасці розных службаў, малая прапускная здольнасць «пунктаў», а галоўнае — пагаршэнне агульнага эканамічнага становішча, у сувязі з чым турызм ператварыўся ў камерцыйныя паездкі грамадзян за мяжу.

Старшыня Дзяржаўнага камітэта Г. М. Шкурдзь «заглыбіўся» ў праблемы, з якімі сутыкнулася іх служба, але вымушаны быў у рэшце рэшт прызнаць: мы ўсе не былі гатовы да «лібералізацыі» выезду.

Думаецца, меў рацыю міністр замежных спраў Пётр Краўчанка, калі адзначыў: мы — маладая дзяржава. Але і двухбаковыя пагадненні з суседзямі, якія мы заключаем, і іншыя захады даюць падставы сцвярджаць, што справы ў хуткім часе паправяцца.

Вырашана да гэтай праблемы вярнуцца зноў.

Многіх па-ранейшаму хвалюе пытанне: будзе ў нас рэферэндум ці не?

Заключэнне Цэнтральнай камісіі па рэферэндуму Рэспублікі Беларусь па выніках праверкі падпісных лістоў рэферэндуму нядаўна поўнасцю змешчана ў друку. Таму няма неабходнасці вяртацца да яго. Вырашана ўключыць пытанне аб правядзенні рэферэндуму Рэспублікі Беларусь у праект павесткі дня чарговай сесіі Вярхоўнага Савета.

Пасля ўсебаковага абмеркавання зацверджана Палажэнне аб Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Дзяржаўныя прэміі — іх дзесяць, — будуць прысуджацца раз у два гады (кожны цотны год). У склад Камітэта па Дзяржаўных прэміях увайшлі вядомыя беларускія пісьменнікі, паэты, кампазітары, драматургі, артысты...

Разгледжаны таксама іншыя пытанні жыцця рэспублікі.

На пасяджэнні Прэзідыума галоўным рэдактарам газеты «Звязда» зацверджаны Уладзімір Наркевіч.

Васіль НАЙДЗІН.

ЖЫЦЬ, ЯК ДОБРЫЯ СЯБРЫ

«Я рад вітаць вас, пан Прэзідэнт, на беларускай зямлі», — гэтымі словамі Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч вітаў ля трапа самалёта Прэзідэнта Фінляндскай Рэспублікі Маўна Койвіста, які прыбыў 20 мая з аднадзённым рабочым візітам.

Кіраўнікі Беларусі і Фінляндыі сустрэліся як добрыя знаёмыя. У лютым гэтага года Станіслаў Шушкевіч знаходзіўся ў Хельсінкі, дзе падпісаў Заключны акт Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе. Там і адбылося яго знаёмства з Прэзідэнтам Фінляндыі. Памятаецца, пасля вяртання з паездкі Станіслаў Станіслававіч гаварыў: «Фінляндыя многа гадоў была добрым партнёрам Савецкага Саюза. І мне вельмі хацелася б, каб усе добрыя справы знайшлі працяг ва ўзаемаадносінах Беларусі і Фінляндыі».

Працэдура сустрэчы была ўрачыстай і афіцыяльнай, адпаведна статусу высокага госця. Дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах паднеслі Прэзідэнту хлеб-соль. На лётным полі выстраілася ганаровая варта. Маўна Койвіста прымае рапарт камандзіра роты. Пасля выканання дзяржаўных гімнаў кіраўнікі дзяржаў абыходзяць строй ганаровай варты.

Разам з Прэзідэнтам Фінляндскай Рэспублікі прыбылі міністр замежных спраў гэтай краіны Паава Вяюрунен, іншыя афіцыяльныя асобы. Сярод сустракаўшых — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Фінляндскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Тайста Вейка Толванен.

Побач са Станіславам Шушкевічам міністр замежных спраў Беларусі Пётр Краўчанка, міністр абароны Павел Казлоўскі, іншыя афіцыяльныя асобы.

Маўна Койвіста знаёміцца з членамі дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў Мінску.

З аэрапорта кіраўнікі дзяржаў у суправаджэнні ганаровага эскорту матацыклістаў накіраваліся на мемарыяльны комплекс «Хатынь». У глыбокім маўчанні, якое перапынялася толькі сумным боем званоў, абышлі яны могілкі вёсак, пастаялі ля брацкай магілы жанчын, старых, дзяцей, зажыва спаленых гітлераўскімі карнікамі ў сакавіцкую раніцу 1943 года.

Высокі госць усклаў кветкі да Вечнага агню мемарыяла. Мінутай маўчання Маўна Койвіста, Станіслаў Шушкевіч і суправаджаючыя іх афіцыяльныя асобы ўшанавалі памяць ахвяр фашызму. «Надзея чалавецтва — у будучыні, і яна будзе больш светлай, чым мінулае», — такі запіс пакінуў у кнізе ганаровых наведвальнікаў мемарыяльнага комплексу Прэзідэнт Фінляндскай Рэспублікі.

Затым ва ўрадавай рэзідэнцыі «Заслаўе-1» ад імя Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь у гонар Прэзідэнта Фінляндыі было дадзена афіцыяльнае снеданне.

Выступаючы на снеданні з прамовай, Маўна Койвіста падзякаваў за сардэчны прыём на беларускай зямлі. Выказаў упэўненасць у тым, што дыялог, які пачаўся паміж дзвюма краінамі, будзе плённа развівацца.

—Дзякуючы членству ў ААН Беларусь ужо на працягу дзесяцігоддзяў удзельнічае ў міжнароднай палітыцы, — сказаў ён. — Далучэнне рэспублікі да краін—удзельніц Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе азначае яе гатоўнасць актыўна супрацоўнічаць у рамках гэтага працэсу ў імя стрымлівання новых пагроз палітычнага, эканамічнага і экалагічнага характару на нашым кантыненце.

— У Беларусі, дзе чарнобыльская ядзерная катастрофа нанесла нязмерны ўрон, — падкрэсліў Прэзідэнт Фінляндыі, — наўрад ці трэба гаварыць аб неабходнасці ўмацоўваць сумесную бяспеку, незалежна ад таго, ці з'яўляецца яна пагрозай ваеннай, тэхналагічнай або экалагічнай.

На думку Маўна Койвіста, дзяржаўная незалежнасць Беларусі стварае новы фундамент для двухбаковых адносін паміж краінамі. Праяўленнем гэтага стануць падпісваемае ў час цяперашняга візіту пагадненне аб гандлі і эканамічным супрацоўніцтве і рыхтуемае пагадненне аб абароне капіталаўкладанняў.

У 15 гадзін пачаліся афіцыяльныя перагаворы дэлегацый Рэспублікі Беларусь і Фінляндскай Рэспублікі на чале са Станіславам Шушкевічам і Маўна Койвіста. Былі абмеркаваны перспектывы далейшага супрацоўніцтва ў палітычных, гандлёва-эканамічных і іншых сферах.

Праз гадзіну фінская дэлегацыя сустрэлася з групай беларускіх парламентарыяў.

(БЕЛТА).

НА ЗДЫМКУ: у час перагавораў. Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

Лепш жыць бядней?

Мы многа гаворым сёння аб рынку, рыначнай эканоміцы, новых умовах гаспадарання. Але што гэта такое на справе, як сябе паводзіць, чаго чакаць у бліжэйшы час? У красавіку-маі гэта высвятляла СЛУЖБА ВЫВУЧЭННЯ ГРАМАДСКАЙ ДУМКІ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ.

Як аказалася, **тры чвэрці апытаных** ужо маюць уяўленне аб самых агульных рысах рыначнай эканомікі і далейшых яе перспектывах. А вось **ці ўсе аказаліся гатовымі да яе сустрэчы рэальна?**

Тры чвэрці чакалі ад рынку лепшага і цяпер лічаць сваё становішча нездавальняючым, а **дзве трэці** сцвярджаюць, што маглі б працаваць у такіх умовах значна больш эфектыўна, але не робяць гэтага, бо **кожнаму другому**, напрыклад, перашкаджае «адсутнасць матэрыяльнага інтарэсу». **Палавіна апытаных** заявіла, што гатова рызыкаваць, дзейнічаць з ініцыятывай, каб жыць больш заможна, **другая ж палавіна** лічыць, што лепш жыць бядней, затое мець гарантаваны ўзровень жыцця. **40 працэнтаў** хацелі б заняцца ўласнай справай, прадпрымальніцкай дзейнасцю, бачачы пры гэтым для сябе неблагія перспектывы.

Што ж на практыцы робяць нашы суайчыннікі, каб прыстасавацца да новых умоў? Самы просты, але, відаць, і нялёгкі шлях — скарачаць расходы на харчаванне, культурныя мерапрыемствы, нават гаспадарку — гэта адзначылі **42 працэнты** апытаных. Найбольш эканоміць даводзіцца цяпер пенсіянерам, работнікам культуры, адукацыі, навукі.

Рабочыя, служачыя прамысловасці, будаўнікі, транспартнікі, а таксама студэнты выкарыстоўваюць любую магчымасць, каб падзарабіць, прычым тут спектр шырокі: дзяржаўныя прадпрыемствы, камерцыя — перапродаж, спекуляцыя, (гэта адзначыў кожны дзесяты рабочы і кожны шосты студэнт). **2—3 працэнты** апытаных сярод гэтай катэгорыі маюць намер пачаць уласную справу.

Важнай крыніцай паляпшэння свайго дабрабыту чвэрць работнікаў гандлю і амаль палавіна прадпрымальнікаў лічаць паездкі ў «блізкае» і «далёкае» замежжа — Польшчу, Румынію, Турцыю, Кітай, а таксама перапродаж рознага тавару на радзіме — сярод прадпрымальнікаў гэтым займаюцца **29**, а сярод работнікаў гандлю — **17 працэнтаў**.

І апошняе, што хацелася б тут адзначыць. Пераважная большасць нашых суайчыннікаў у данай сітуацыі спадзяецца выключна на сябе, на свае сілы, свой вопыт і веды. І толькі **2—3 працэнты** апытаных рабочых, работнікаў культуры, адукацыі спадзяюцца на палітычныя метады паляпшэння ўмоў свайго жыцця — забастоўкі і мітынгі.

СТРАДЫЦЫЁФАКТ

Адбылася нарада кіруючага саставу Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Міністр абароны генерал-палкоўнік Казлоўскі праінфармаваў афіцэраў і генералаў аб вынніках сустрэчы кіраўнікоў дзяржаў СНД у Ташкенце. На нарадзе ў Міністэрстве абароны ішла таксама размова пра іншыя надзённыя праблемы. Працягваецца фарміраванне апарату міністэрства на базе штаба і ўпраўлення былой Беларускай ваеннай акругі. Спецыяльная група працуе над стварэннем праграмы па скарачэнню ўзброеных сіл.

20 мая дэлегацыя Беларускага камітэта абароны міру выехала ў Германію па запрашэнню грамадскіх арганізацый. У яе саставе рабочыя, працаўнікі вёскі, прадстаўнікі інтэлігенцыі, тыя, каго прынята называць у такіх выпадках народнымі дыпламатамі. Прыхільнікі міру суверэннай Беларусі прымуць удзел у Тыдні міру, які пройдзе на зямлі Паўночны Рэйн—Вестфалія з 21 па 31 мая.

20 мая адкрыўся традыцыйны міжнародны Будапешцкі кірмаш. У Вене — чарговая сесія Канферэнцыі Арганізацыі краін — экспарцёраў нафты (АПЕК). У Лісабоне — Міжнародная выстаўка альтэрнатыўных крыніц энергіі, а ў Варшаве — 27-ы Міжнародны кніжны кірмаш.

У Парыжы працягваецца сесія Выканаўчага савета ЮНЕСКО. На парадку дня — фінансавыя праблемы арганізацыі і стварэнне ў рамках ЮНЕСКО інтэлектуальнага форуму, заклікананага аб'яднаць намаганні выдатных дзеячаў навукі і культуры.

Узняць заработную плату да 20 тысяч рублёў, замяніць зношаную тэхніку і забяспечыць машыны запаснымі часткамі — такія асноўныя патрабаванні вадзіцеляў мінскіх аўтобусаў, якія правялі 19 мая папераджальную забастоўку. На некалькі гадзін яны спынілі работу практычна на ўсіх гарадскіх маршрутах. У выпадку ігнаравання іх патрабаванняў вадзіцелі пагражаюць усеагульнай забастоўкай.

20 мая — 90 гадоў з дня нараджэння беларускага паэта Язэпа Пушчы (Іосіфа Паўлавіча Плашчынскага). Нарадзіўся ён у вёсцы Каралішчавічы Мінскага раёна, а пражыў усяго 62 гады. Працаваў настаўнікам, у Інбелкульце, выдавецтве. Адзін з заснавальнікаў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», Друкавацца пачаў з 1922 года. Яго лірыка прасякнута матывамі бадзёрасці, радасці, жыццесцвярджэння. Аўтар паэтычных зборнікаў, паэм «Песні вайны», «Крывавы плакат», «Бор шуміць», казкі для дзяцей «На Бабрыцы».

Як і многія беларускія дзеячы таго часу, Язэп Пушча перажыў неабгрунтаваныя рэпрэсіі сталінізму і высылку, але паэзія яго засталася светлай па настрою, мажорнай па гучанню.

КАЛУН НА ЭКСПАРТ...

Упершыню Мінскі трактарны завод прыме ўдзел у Сусветным ніжагародскім кірмашы «Падсобная гаспадарка», які пройдзе з 28 мая па 1 чэрвеня ў горадзе на Волзе.

Туды адпраўлены мотаблок «Беларусь» МТЗ-06 з наборам сельгаспрылад — плугам, акучнікам, касілкай, культыватарам і паўпрычэпам. На міжнародны паказ трактарабудаўнікі прадставяць таксама тавары шырокага ўжытку: тумбу-ложак, дзіцячае крэсла, сякеру-калун і садовыя ножніцы. Ёсць надзея, што ўдзел у ніжагародскім кірмашы забяспечыць калектыву стабільнасць збыту прадукцыі і дасць магчымасць вывучыць рынак СНД і замежных краін.

Алег ПРАЦЬКО.

Інфармацыі было шмат. Будзе яшчэ больш

Апошнія дні дажывае інфармацыйнае тэлеграфнае агенцтва Беларусі — БелТА, якое доўгія гады з'яўлялася рупарам афіцыяльнай прапаганды.

А паколькі жыццё наша напоўнена разнастайнымі падзеямі, то святое месца пустым не застанецца — прынята рашэнне аб утварэнні новага агенцтва — Белінформ.

«ЭНКА» — ГЭТА НЕ ПАНЕНКА

СЛОНІМ, 20. (Кар. БелаПАН Васіль ТАПАРКОЎ). Учора раніцай 600, па іншых звестках 800, нашых землякоў, якія працуюць у турэцкай будаўнічай фірме «ЭНКА», абвясцілі страйк. Іх патрабаванні амаль не адрозніваліся ад умоў, якія сёння гэтак часта выстаўляюць рабочыя і службоўцы айчынных прадпрыемстваў — павелічэнне заработнай платы, паляпшэнне бытавых умоў, захаванне правіл тэхнікі бяспекі. Удзельнікі страйка аргументавалі свае дзеянні тым, што іх турэцкія калегі за аналагічны аб'ём работы атрымліваюць прыкладна у дзесяць разоў больш.

Праз некалькі гадзін пасля пачатку страйка амаль усім яго ўдзельнікам заявілі, што яны... звольнены. Аднак іх пратэст падтрымалі іншыя беларускія рабочыя з гэтай фірмы. Сёння чакаецца прыезд у Слонім камісіі з Мінска і прадстаўніка заходнегерманскай фірмы-заказчыка будоўлі дзеля вырашэння канфлікту.

Казімір ТУРУТА: «НЯВАРТА ПАДРАЗАЦЬ САБЕ КРЫЛЫ»

Адной з прыкмет таго, што грамадства ўсё-такі рушыць у патрэбным напрамку, можна лічыць і ўзрослую ролю ў яго жыцці банкаў. Раней, у часы эканомікі, цалкам падпарадкаванай адзіна правільнай ідэалогіі, на гэта няварта было і сладзявацца. Банкі былі, а ролі іх не было. Дакладней — банкаўскія ўстановы выконвалі функцыі не банкаўскія, а хутчэй казначэйскія пры бюджэце. Органы ўлады вырашалі, каго і на якіх умовах крэдытаваць, а банк адлічваў патрэбныя сумы.

Сёння банкі праводзяць сваю палітыку. Чым яны кіруюцца ў пытаннях фінансавай стратэгіі і тактыкі? Які плён прыносіць свабода?

На пытанні карэспандэнта «Звязды» адказвае старшыня праўлення мінскага камерцыйнага банка рэканструкцыі і развіцця «Мінскбізнесбанк» Казімір ТУРУТА.

— Казімір Вацлававіч, якая ступень свабоды «Мінскбізнесбанка» ў параўнанні, скажам, з колішнім Жылсацбанкам, на базе якога ён быў створаны?

— Пачнём з таго, што і зараз існуе шмат абмежаванняў. Парламентам прыняты спецыяльныя законы і пастановы па банках, банкаўскай сістэме, крэдытнай палітыцы, якія ў многім рэгламентуюць нашу дзейнасць. Але, нягледзячы ні на што, можна сказаць: камерцыйныя банкі атрымалі пэўную свабоду. Над імі няма ранейшых вышэйстаячых структур і звеняў — ажно да Масквы. Знікла такая кіруючая структура, як КПБ, і органы ўлады ўжо не маюць рашаючага слова ў кіраванні крэдытнымі рэсурсамі. Гэта шмат.

— Значыць, сваёй волі вам ніхто не навязвае, і кліентаў вы сабе выбіраеце самі?

— Альбо мы іх, альбо яны нас.

— Кажуць, што ў падборы кліентаў вы праяўляеце пэўную асцярожнасць, патрабуеце рэкамендацый, гарантый...

— Прадпрымальніцтва ў рэспубліцы толькі пачынаецца, і, як у любой новай справе, тут ёсць шмат некампетэнтных людзей, трапляюцца і проста несумленныя. Таму асцярожнасць пры крэдытаванні неабходная. Прыклад МІКАбанка, дзе так не лічылі і з-за гэтага займелі сур'ёзныя непрыемнасці, пераконвае ў правільнасці ўзятай намі лініі. Сумніцельных кліентаў мы ў сябе не ведаем. Наогул, рэпутацыя кліентаў — гэта рэпутацыя банка.

— Якім крытэрыям трэба адпавядаць, каб атрымаць у вашым банку крэдыт?

— Па-першае, мы, у асноўным, даём крэдыты тым, хто ў нас абслугоўваецца. Мы маем іх разліковыя рахункі і можам меркаваць аб становішчы спраў. З другога боку, калі мы даём крэдыт, патрэбны нейкія гарантыі яго вяртання. Альбо гэта гарантаздольная арганізацыя, альбо мае сродкі пад заклад. У даверным плане крэдыты мы сёння выдаём рэдка. А яшчэ зачастую патрабуем, каб кліент застрахаваўся.

— Пад які працэнт вы пазычаеце грошы?

— Пакуль што на ўзроўні дваццаці пяці працэнтаў гадавых, але хутка будзем павышаць.

— У Маскве, я чуў, часам патрабуюць адзін працэнт у дзень.

— Там сапраўды вельмі высокія працэнты, нам да іх далёка. Але мы і свае 25 бяром далёка не з усіх. Калі крэдытуем нейкія сацыяльныя праграмы, гарадское будаўніцтва — працэнт мінімальны. Затое з якога-небудзь камерсанта можна ўзяць і болей. Так і манеўруем.

— «Мінскбізнесбанк» у параўнанні з іншымі вельмі мала сябе рэкламуе. Чаму?

— Шчыра кажучы, не бачым у гэтым неабходнасці. Наша рэклама — гэта наша работа. Недахвата жадаючых атрымаць крэдыт мы не адчуваем, а новыя кліенты ідуць да нас пад уплывам інфармацыі з дзёвалых колаў. Нас знаходзяць і без шырокай рэкламы.

— Казімір Вацлававіч, скажыце, калі ласка, ці выгадна сёння быць вашым акцыянерам?

— Гэта з якога боку глядзець. За мінулы год мы выплачвалі дывідэнды ў размеры 16,3 працэнта. Канешне, малавата. Сёлета будзе больш, але ўсё роўна не намнога вышэй узроўню інфляцыі. Таму, каб нехта, замест таго каб трымаць грошы ў нашым банку, уклаў іх у выгадную справу, даход ён меў бы і большы. Затое нашы кліенты не маюць праблем з крэдытаваннем і, наогул, мы ім забяспечваем прыярытэтнае абслугоўванне.

— Не так даўно публікаваўся спіс 100 буйнейшых банкаў рублёвай зоны. Ваш банк туды не патрапіў. А ў рэспубліцы «Мінскбізнесбанк» на якім месцы?

— У сотню мы сапраўды не трапілі. Але мне не да канца зразумела, па якіх крытэрыях той спіс складаўся. У яго ўвайшлі два беларускія банкі — «Беларусь» і «Прыорбанк». Устаўны капітал у іх большы за наш. Але, калі за аснову падлікаў браўся ўстаўны капітал, невядома, чаму ў спіс не трапілі такія гіганты, як Прамбудбанк і Аграпрамбанк, у якіх ён разы ў тры большы? А калі глядзець па абаротах, па крэдытных рэсурсах, па запазычанасцях, дык усе падставы быць у гэтым спісе ў нас ёсць.

У рэспубліцы мы на трэцім месцы — пасля Аграпрамбанка і Прамбудбанка (Ашчадны банк я не лічу — у яго свая спецыфіка, работа з насельніцтвам). Але тыя два банкі, што прызнаны аднымі з буйнейшых у СНД, у Беларусі далёка не самыя буйныя.

Аднак, калі ацэньваць наша становішча ў рублёвай зоне сур'ёзна, дык перспектывы, на жаль, не лепшыя. Беларускія заканадаўцы ўстанавілі сваім банкам маржу на ўзроўні 7 працэнтаў. Жыць на такія грошы можна, а вось паспяхова развівацца — наўрад ці. Між тым, менавіта моцныя банкі ствараюць моцную эканоміку. Той, хто гэта не разумее, сам падразае сабе крылы. Расійскія ж банкі такіх абмежаванняў не маюць, а калі ўлічыць і больш спрыяльную падатковую палітыку, то ў адзінай з намі рублёвай зоне магчымасці для накаплення ўласных грошай яны маюць большыя.

— Якую стратэгію вы для сябе выпрацавалі ў сённяшніх цяжкіх умовах? Хоць у агульных рысах, калі ласка.

— Як я ўжо казаў, мы імкнёмся ўкладваць сродкі ў надзейныя мерапрыемствы з хуткай аддачай. Крэдытуем дзяржаўныя прадпрыемствы, якія працуюць стабільна, без спадаў. Спрыяем развіццю перспектыўных напрамкаў у прадпрымальніцтве. Атрымліваецца, недзе 50 працэнтаў укладваем у дзяржсектар, 50 — у камерцыйныя структуры.

Хутка ў нас з'явіцца магчымасць крэдытавання больш буйных праектаў, на якія раней проста не хапала сродкаў. Справа ў тым, што «Мінскбізнесбанк» на добраахвотнай аснове аб'ядноўваецца яшчэ з трыма банкамі, — «Жылкамбанкам», «Могабанкам» (Магілёў) і «Гроднакамбанкам». Аб'яднаны банк атрымае назву «Белбізнесбанк». Пашырыцца геаграфія нашай дзейнасці, узрасце ўплыў на эканоміку рэспублікі, з'явіцца магчымасць больш эфектыўна манеўраваць сродкамі.

Да вельмі важных крокаў аднёс бы і стварэнне нашым банкам народнай кампаніі «Садружнасць» з мэтай прыцягнення грашовых накапленняў грамадзян рэспублікі. Людзям такое партнёрства, здаецца, яшчэ больш выгаднае, чым нам. Іх зберажэнні захоўваюцца лепш, чым у Ашчадным банку (працэнт вышэйшы, а ў рызыкоўныя праекты мы гэтых грошай укладваць не збіраемся), і, апрача таго, мы плануем наладзіць забеспячэнне нашых акцыянераў таварамі народнага спажывання без усялякіх купонаў і па даступных цэнах (знешнегандлёвая дзейнасць у наш статут таксама закладзена). Павінна атрымацца нядрэнна.

— Ці існуе для вашага банка праблема наяўных грошай?

— Цяпер, відаць, няма банка, для якога яна не існавала б. Увесь час даводзіцца шукаць для некага круглую суму. Напрыклад, звяртаюцца з трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення: дапамажыце, бо вадзіцелі забастоўкай пагражаюць, калі зарплаты не будзе. Асабіста мяне гэта забастоўка не закране — пешкі дайду. А спозніцца чалавек 20 у банк на работу — таксама вялікай бяды не будзе. Але трэба разумець, якую шкоду гэта нанясе гораду. І вадзіцеляў тых таксама трэба зразумець — калі чалавек жыве ад зарплаты да зарплаты...

Сітуацыя з наяўнасцю мае тэндэнцыю да пагаршэння. Можа, разліковыя білеты, што ў чэрвені ў абарачэнне выпусцяць, хоць крыху дапамогуць? Гэта ж амаль сапраўдныя грошы, не тое, што гэтыя, аднаразовыя, на якія, магчыма, наогул паперу псаваць не варта было. Яны павінны зняць напружанасць. Вось толькі для падліку іх дадатковыя людзі спатрэбяцца, будуць і іншыя выдаткі.

— Казімір Вацлававіч, калі параўнаць ваш банк і банк у якой-небудзь цывілізаванай рыначнай краіне, не абавязкова ў Швейцарыі, дык якая паміж імі розніца?

— Мы яшчэ пачынаем, і ў нас цяжкая спадчына дзесяцігоддзяў дзяржаўнай арыентацыі ў развіцці банкаўскай сістэмы. Нават спецыялістам перабудавацца — праблема. Да таго ж, там капітал стары, а мы свой толькі ствараем. Там — надзейная цывілізаваная кліентура, а ў нас слой сапраўдных прадпрымальнікаў яшчэ не сфарміраваўся. І галоўнае — замежныя банкі кіруюцца законамі, якія даўно «абкатаны» і нармальна дзейнічаюць, а ў нас увесь час нараджаюцца новыя законы, і тыя любы чыноўнік можа паварочваць на свой лад.

Але гэта ўсё часовыя цяжкасці. Скончыцца калі-небудзь арганізацыйны перыяд, скончыцца гіперінфляцыя, увойдзе ўсё ў норму.

Будзем жыць, як людзі.

— Дзякуй за гутарку.

Аляксандр БЯРСУДСКІ.

ТВАЁ СЛОВА, ЧЫТАЧ!

«Сервіс» з лаянкай

У нас, былых воінаў-афганцаў, і без таго, як кажуць, кошкі на душы скрабуць — так жорстка, бязлітасна з намі абышліся. І вельмі крыўдна, балюча бывае, калі нам па-ранейшаму сыплюць соль на раны. Вось канкрэтны прыклад чэрствасці і грубасці, з якімі 14 красавіка я сутыкнуўся ў маладзечанскай гасцініцы «Турыст».

Сюды трапіў праездам. Звяртаюся да дзяжурнага адміністратара і прашу пасяліць мяне ў аднапакаёвы ці ў крайнім выпадку ў двухпакаёвы нумар. Тлумачу, што я былы воін-афганец, інвалід II групы і мне па стану здароўя патрэбны цішыня, спакой. Думалася, работніца гасцініцы прыслухаецца, дапаможа. Як бы не так! Яна з грубай лаянкай накінулася на мяне, катэгарычна адмовіла, заявіўшы, што ў яе «такіх месц няма».

А тут падышоў да акенца грамадзянін з паўднёвай рэспублікі. Нечакана з'явіўся і яго суайчыннік, які, як высветлілася, адзін займаў двухмесны нумар. Бессаромна працягнуў ён 20 рублёў і сказаў: «Пасялі сябра да мяне». І адміністратар адразу ж пасяліла. На маю справядлівую заўвагу яна адрэагавала так: «Ну і што! Ён у мяне з самай раніцы прасіў гэта месца».

З горам папалам мне знайшлі ложак у чатырохмесным пакоі. І то толькі пасля таго, як «прынцыповая» работніца гасцініцы ў катэгарычнай форме запатрабавала пасведчанне. Глянула і раптам западозрыла, што яно несапраўднае. Нават пасля таго, як нарэшце выдзеліла мне месца, двойчы прыбягала ў пакой і патрабавала пасведчанне, каб пераканацца, ці той я на самай справе, за каго сябе выдаю. Каб вы ведалі, як гэта для мяне было крыўдна і зневажальна!

Аляксандр ШАВЕЛЬ,
былы воін-афганец,
інвалід II групы.

г. Мінск.

АД РЭДАКЦЫІ. Тры з палавінай гады Аляксандру Навумавічу давялося прабыць у Афганістане. І як урач-хірург увесь гэты час ён ратаваў ад смерці і лячыў параненых баявых сяброў. Але здарылася так, што і сам трапіў у «пераплёт», пасля чаго ледзь застаўся ў мывых. І цяпер вось інвалід «на ўсе астатнія гады».

Нялёгка было пакалечанаму воіну дабрацца да Дома друку, яшчэ цяжэй — падняцца на другі паверх, у рэдакцыю «Звязды». Прыехаў, каб з горыччу расказаць аб тым, як «заляваў» у маладзечанскай гасцініцы. Не, не за месца, а за справядлівасць, за сваю чалавечую годнасць, супраць тых беспардакаў, якія там сталі звычайнай з'явай.

А. Шавель захапіў з сабой дасланую яму ў Мінск выпіску з загада, які падпісаў генеральны дырэктар гарадскога вытворчага аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі пры Маладзечанскім гарвыканкоме С. Татарынові́ч. У гэтай паперыне гаворыцца, што адміністратар гасцініцы Т. Шуцкая за неабгрунтаваную адмову ў прадастаўленні А. Шавелю двухмеснага нумара і нетактоўныя паводзіны «прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці — ёй аб'яўлена заўвага».

Вось дык напалохалі! Наўрад ці пасля такога спагнання ў маладзечанскім «Турысце» ўсталюецца сервіс без грубасці і лаянкі.

Пішыце болей праўды!

Паважаная рэдакцыя «Звязды», на працягу многіх гадоў з'яўляюся пастаянным чытачом вашай газеты. Яна вельмі цікавая, чытаю яе ад першай да апошняй літары. І, скажу шчыра, таму, што ў газеце закрануты ўсе бакі нашага жыцця, асабліва ў гэты цяжкі для нас час. Дзякуй вам за ўсё, аб чым вы расказваеце на старонках газеты. І ў далейшым пішыце болей праўды. Бо праз друк просты чалавек даведваецца пра тое, што ад нас хавалі дзесяцігоддзямі.

Творчых поспехаў усім супрацоўнікам газеты «Звязда» ў іх нялёгкай працы.

З павагай
Н. НЕПАЧАЛОВІЧ.

г. Гомель.

Глумленне над памяццю

У лясным урочышчы «Бор», якое прымыкае да горада Скідаля, знаходзяцца дзве брацкія магілы. У адной з іх спачываюць жыхары вёсак Залясяны і Кашубінцы, расстраляныя фашыстамі ў красавіку 1944 года, у другой — камсамольцы-падпольшчыкі, забітыя 13 верасня 1942 года. Пазалетась тут устанавілі новыя помнікі-абеліскі, тэрыторыю добраўпарадкавалі. У памятныя дні, вось ужо шмат дзесяцігоддзяў, сюды збіраюцца людзі, сярод якіх родныя і блізкія загінуўшых, каб ушанаваць іх памяць, ускласці кветкі і вянкі да магільных узгорачкаў.

Месца захаванняў знаходзіцца на ўзвышшы, як бы ўзвышаючы тым самым памяць аб загінуўшых. Здавалася б, ахвярам Вялікай Айчыннай вечна спаць спакойным сном, гэтак жа думалі іх родныя і блізкія. Ды дзе там... Нядаўна ДБУ-18 пачало тут... распрацоўваць кар'еры па нарыхтоўцы пяску для будаўніцтва дарог, метр за метрам набліжаючыся да святога для кожнага скідальчанина месца. Прычым, як высветлілася, начальнік ДБУ Ф. Сяўко адкрыў кар'еры самавольна, нават не ўзгадніўшы гэтае пытанне з уладамі горада Скідаля і Гродзенскага раёна. Пазоўле слоў намесніка старшыні райвыканкома У. Чувака, кіраўнік ДБУ абяцаў кар'еры рэкультываваць, на месца аднаго з іх завезці ўрадлівы грунт і зрабіць лужок. Сапраўды, з аднаго боку кар'ер ужо рэкультываваны. Але як? Так і засталася глыбокая яма, якая будзе перашкаджаць пад'езду і падыходу да брацкіх магіл.

І яшчэ адно пытанне да намесніка старшыні райвыканкома У. Чувака, які адказвае за адкрыццё кар'ераў у раёне: чаму кар'ер рэкультываваді толькі з аднаго боку, а з другога яго працягваюць распрацоўваць? Адным словам, глумленне над памяццю працягваецца.

І. БАРЫСАЎ,
член райённай
камісіі «Памяць».

г. Скідаль.

ЧАЛАВЕК. ПРАВА. МАРАЛЬ.

Што і як баронім?

Ці даўно мы з гордасцю гаварылі пра сябе: найвялікшая краіна свету! І жылі, сяліліся, як Бог на душу пакладзе: беларусы — аж на Крайняй Поўначы і Далёкім Усходзе, рускія — на Украіне і ў Беларусі... Здаецца, не дужа пільна ўзіраліся ў той параграф, што тычыўся нацыянальнасці — быў бы чалавек добры. І раптам, як у тых бязладных сем'ях, пачаліся скасаванні шлюбаў, дзяльба маёмасці. Паўсталі пагранічныя слупы там, дзе яны спрадвеку не стаялі. А людзі засталіся тымі ж. Хіба чужымі для маці стаў сын ды дачушка, якія па волі лёсу апынуліся па той бок кардону? На апошнія грошы купіла бабуля ўнучкам-маскавічкам па шубцы. Але ўручыць не ўдалося: пільныя ахоўнікі спажывецкага рынку канфіскавалі падарункі ды яшчэ аштрафавалі старую.

З 25 кастрычніка 1990 года дзейнічае Закон «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку Рэспублікі Беларусь». Меры, як бачым, часовыя. Але, як кажуць, нішто не бывае такім пастаянным, як часовае. Даўно спала эйфарыя ад спадзявання, што абмежаванні ў вывазе наталяць тавары голад на ўнутраным рынку.

А вось горыч, слёзы, расчараванні, а то і праклёны засталіся, множацца.

У рэдакцыю «Звязды» звярнуўся мінчанін Уладзімір Лунцэвіч. У пачатку года да іх у госці прыехала стрыечная сястра Людміла Тунік, што пражывае за межамі рэспублікі. Радня з нагоды яе 45-годдзя вырашыла падарыць ёй халадзільнік. Аднак на пероне Мінскага чыгуначнага вакзала міліцыя канфіскавала той халадзільнік, апрача таго, суд «узнагародзіў» сваячніцу штрафам у 5 тысяч рублёў.

За тлумачэннем гэтай і падобных сітуацый мы звярнуліся да начальніка аддзела па нагляду за выкананнем заканадаўства аб адміністрацыйных правапарушэннях Пракуратуры Рэспублікі Беларусь, старшага саветніка юстыцыі І. К. РЭУЦКАГА.

— Што да гэтага канкрэтнага выпадку, — гаворыць Ігар Кузьміч, — то тут прадстаўнікамі праваахоўных органаў дапушчаны істотныя памылкі. У прыватнасці, Людмілу Тунік затрымалі не пры спробе пагрузкі ў вагон забароненага тавару, а на пероне чыгуначнага вакзала за 2 гадзіны да адпраўлення поезда. Яе брат і муж у гэты час знаходзіліся ў багажным аддзяленні, дзе яны афармлялі груз на адпраўку. Паколькі ім растлумачылі, што падобныя грузы нельга адпраўляць за межы рэспублікі без спецыяльнага на тое дазволу, яны паспрабавалі забраць назад той халадзільнік і даставіць яго на кватэру Лунцэвіча. Але тут умяшалася міліцыя і арыштавала груз. Не ўніклі як след у справу і Кастрычніцкі раённы народны суд Мінска, які канфіскаваў халадзільнік і аштрафаваў Людмілу Тунік на 5 тысяч рублёў, а таксама Мінскі гарадскі суд, што пакінуў рашэнне раённага ў сіле. Пракуратура Рэспублікі Беларусь днямі апратэставала рашэнне суда.

— Я так разумею, што гэта не адзінкавы падобны факт, які мяжуе з самаўпраўствам? Нездарма ж у народзе кажуць: загадай дурню Богу маліцца, дык ён і лоб разаб'е.

— Што і казаць, фактаў неабгрунтаваных дзеянняў, а то і злоўжываванняў пры выкананні Закона «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку Рэспублікі Беларусь» хоць адбаўляй. Толькі ў органы Пракуратуры Рэспублікі Беларусь паступіла амаль 900 скаргаў ад грамадзян. І ледзь ці не па кожнай трэцяй справе Пракуратура вынесла пратэсты. Прычым іншы раз супрацоўнікі праваахоўных органаў даходзяць да абсурду. Так, на падставе адміністрацыйнага пратакола, складзенага Савецкім РАУС горада Гомеля, народным судом падвергнута штрафу ў размеры тысяча рублёў загадчыца магазіна № 14 Хюлькевіч за ўтойванне ад пакупнікоў тоны масла. Між тым, праверкай было ўстаноўлена, што пратакол гэты складзены праз 25 мінут з моманту паступлення прадукту ў магазін, і, зразумела, яго работнікі проста не маглі за такі тэрмін расфасаваць масла.

Велізарныя штрафы накладваюцца за малазначныя правапарушэнні. Так, начальнікам Цэнтральнага РАУС горада Гомеля быў накладзены штраф у тысячу рублёў на грамадзяніна Піліпенку, які прадаў адзін пачак цыгарэт і атрымаў 75 капеек «навару». Такі ж выпадак адбыўся і з мінчанінам Я. Опманам, якога намеснік начальніка Цэнтральнага РАУС сталіцы прыцягнуў да адміністрацыйнай адказнасці за продаж на Старажоўскім рынку пачка цыгарэт. Дарма спрабаваў даказаць чалавек, што ў яго маленькая пенсія, што жонка анкалагічная хворая, і не ад добрага жыцця панёс ён тыя цыгарэты на рынак. І яго таксама аштрафавалі на тысячу рублёў за 75 капеек «нажывы». У райаддзеле міліцыі не прынялі пад увагу пратэсты ні раённага пракурора, ні пракурора горада. І толькі па пратэсту Пракуратуры Рэспублікі Беларусь начальнік упраўлення ўнутраных спраў Мінгарвыканкома генерал-маёр міліцыі Барыс Піліпенка адмяніў пастанову свайго падначаленага.

Здараецца, работнікі міліцыі і судоў наогул не ўнікаюць у сутнасць справы пры разглядзе адміністрацыйных правапарушэнняў. Інакш чым растлумачыць той факт, што пастановай Дубровенскага раённага народнага суда 28 кастрычніка мінулага года быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за вываз халадзільніка «Мінск-126» за межы рэспублікі намеснік начальніка аддзела матэрыяльна - тэхнічнага забеспячэння прадпрыемства «Белспецэнерга» Н. Фалей? А ён. аказваецца, наогул не меў ніякага дачынення да гэтай справы. З халадзільнікам быў затрыманы вадзіцель прадпрыемства В. Цярэшчанка. Да таго ж, пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні ў адносінах да Н. Фалея быў складзены амаль праз 2 месяцы пасля затрымання грузу. Як высветлілася ў ходзе праверкі, праведзенай пракуратурай, дазвол на вываз халадзільніка даў намеснік дырэктара гэтага прадпрыемства В. Еўсюкоў. Фалей жа па загаду адміністрацыі паехаў на месца для высвятлення прычыны затрымкі грузу. А паколькі ён першым трапіўся пад руку супрацоўнікам міліцыі, тыя і склалі на яго пратакол. У сваю чаргу Дубровенскі народны суд, не разабраўшыся, аштрафаваў Н. Фалея на 5 тысяч рублёў. Дарэчы, Віцебскі абласны суд пакінуў рашэнне ў сіле. Давялося Пракуратуры Рэспублікі Беларусь папраўляць «законнікаў».

— Куды паступаюць канфіскаваныя ў насельніцтва тавары?

— У асноўным іх рэалізуюць праз магазіны. Але і тут не абыходзіцца без злоўжываванняў, у тым ліку і з боку супрацоўнікаў міліцыі. У свой час ковай інспекцыі не перадавалася і адзнакі аб яго знішчэнні не было.

Старшыня народнага суда Ленінскага раёна таго ж Магілёва Т. Аўдзеенка прыцягнула да адміністрацыйнай адказнасці грамадзянку Шышко за продаж чатырох флаконаў французскіх духоў па цэнах, якія перавышаюць дзяржаўныя. Духі канфіскавалі. Пасля гэтага на падставе сваёй жа пастановы яна склала акт аб іх знішчэнні як непрыгодных. Ну і ну! Даведалася б пра гэта фірма, што вырабляе тыя духі, такі вэрхал учыніла б! Французскія духі — свайго роду эталон у парфумерыі. А тут — непрыгодныя...

І наогул, у справе рэалізацыі канфіскаванай маёмасці шмат пралікаў, а часам і злоўжываванняў. Так, падатковай інспекцыяй Савецкага раёна Мінска заключаны дагавор з аб'яднаннем рынкаў, згодна з якім рэалізацыя канфіскаванай маёмасці робіцца ў гандлёва-закупачным магазіне № 3. У ходзе праверкі гэтай гандлёвай кропкі высветлілася, што шэраг камісійных пагадненняў заключаны міліцыяй напрамую з магазінам без запрашэння прадстаўнікоў фінансавага органа і нярэдка без складання актаў ацэнкі і вопісу, што дае магчымасць наўмысна заніжаць кошт тавараў.

— Цікава, чаму работнікі праваахоўных органаў так спяшаюцца з выкананнем пастаноў па адміністрацыйных правапарушэннях? Іншы раз яшчэ да рашэння суда рэалізуюць той ці іншы тавар...

— У першай ступені гэта звязана з пастановай Савета Міністраў РБ № 275 ад 6 лістапада 1990 года, дзе прадугледжваецца «накіраванне не менш 40 працэнтаў сродкаў, атрыманых ад рэалізацыі насельніцтву канфіскаванай прадукцыі, для стымулявання дзейнасці работнікаў кантрольна-наглядной службы, органаў унутраных спраў, судовых выканаўцаў і іншых асоб, якія ўдзельнічаюць у рэалізацыі Закона Рэспублікі Беларусь ад 25 кастрычніка 1990 года». Так, па пастанове начальніка Лепельскага гарадскога аддзела ўнутраных спраў ад 28 мая мінулага года за продаж дзвюх бутэлек гарэлкі па завышанай цане грамадзянінам Рагавенкам апошні быў падвергнуты адміністрацыйнаму пакаранню ў выглядзе штрафу ў 2 тысячы рублёў з канфіскацыяй аўтамашыны ВАЗ-2106 як сродку ўчынення правапарушэння. Рагавенка апратэставаў пастанову начальніка Лепельскага ГАУС ва ўпраўленне ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкома. Оперупаўнаважаны АБКС упраўлення ўнутраных спраў аблвыканкома А. Мацвееў, якому даручылі разбірацца са скаргай, па ўказанню начальніка аддзела ўпраўлення А. Асташонка запатрабаваў з Лепельскага гараддзела адміністрацыйную справу Рагавенкі і канфіскаваную аўтамашыну, хоць необходнасці ў дастаўцы яе ў Віцебску у той час не было. І ўжо 20 мая, яшчэ да прыняцця рашэння па скарзе (адказ быў дадзены 23 мая) Мацвееў накіраваў аўтамашыну ў камісійны магазін, дзе яна і была рэалізавана.

— Ці не на падставе падобных рашэнняў прадстаўнікоў улад і нараджаюцца прымаўкі накшталт таго, што закон — як дышаль?..

— Калі шчыра, то Закон «Аб часовых мерах па абароне спажывецкага рынку Рэспублікі Беларусь», на маю думку, быў прыняты паспешліва, без дэталёвай прапрацоўкі ўсіх магчымых негатыўных вынікаў. Што гэта за закон, калі ён карае невядома за якія грахі, дапускае магчымасці для неабгрунтаваных рашэнняў, розных злоўжываванняў? І наогул, эканамічныя праблемы трэба вырашаць эканамічнымі рычагамі, а не доўбняй, якой можна забіць, аглушыць, але не навучыць. Мы ўжо спрабавалі адміністрацыйнымі мерамі весці барацьбу з п'янствам. Цяпер соромна ўсім — колькі дроў наламалі.

У інфармацыйнай запісцы ў Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь у канцы мінулага года Генеральны пракурор прапануе перагледзець шэраг норм Закона аб ахове ўнутранага рынку. Так, пры затрыманні на прыгранічным з Польшчай КПП тавараў, забароненых для вывазу, а таксама калі перавышана норма вывазу, гэтыя тавары вяртаюцца гаспадарам. Вываз жа аналагічных тавараў, скажам, у Расію, караецца значнымі штрафамі і канфіскацыяй. Да таго ж, КПП абсталяваны на чыгуначных станцыях за дзесяткі, а то і сотні кіламетраў ад граніцы.

Як можна тады канстатаваць «незаконны вываз тавараў за межы рэспублікі»? У такім разе гаворка ідзе пра спробу вывазу. Але адміністрацыйнае заканадаўства не мае такога паняцця, як замах на правапарушэнне. Таму частку І артыкула 10 Закона трэба выкласці ў наступнай рэдакцыі: «Спроба вывазу тавараў...» і далей па тэксту. У запісцы таксама прапануецца зменшыць ніжэйшую мяжу штрафу (напрыклад, ад 200 рублёў і вышэй) і прадугледзець канфіскацыю прылад і сродкаў учынення правапарушэння не абавязковай, а магчымай мерай пакарання. Тым самым народным суддзям і начальнікам міліцыі будзе прадастаўлена магчымасць прызначаць меру пакарання з улікам як матэрыяльнага становішча і асобы правапарушальніка, так і характару правапарушэння.

Гутарыў
Уладзімір ГОЙТАН.

Вынаходнік—камп'ютэр

Мы прывыклі да таго, што традыцыя, якой славіцца Беларусь, мае вагу, з першага погляду пазнаюцца абрысы славутых трактараў, аўтасамазвалаў, сельгаскамбайнаў.

Прадукцыя Мінскай навукова-даследчай лабараторыі вынаходніцкіх машын мае больш сціплы выгляд, але вядомая ў многіх краінах свету. Гэты камп'ютэрны інструмент створаны на стыку тэорыі рашэння вынаходніцкіх задач, функцыянальна - коштавага аналізу і штучнага інтэлекту. Сярод прадпрыемстваў, якія пажадалі выкарыстоўваць распрацоўкі мінскіх навукоўцаў, такія вядомыя фірмы, як БелАЗ, АўтаВАЗ, КамАЗ, Азоўмаш, Кодак і Катэрпілер (ЗША).

У гэтыя дні Мінск стаў месцам правядзення выставы - продажу камп'ютэрнага прадукту. Стваральнікі вынаходніцкіх машын запрасілі вучоных і спецыялістаў з многіх краін СНД і з-за мяжы. Ідзе ажыўлены абмен думкамі, перадаецца вопыт, наладжаны кансультацыі, заключаюцца новыя дагаворы.

НА ЗДЫМКАХ: у рабоце выставы-продажу прымае ўдзел інжынер лабараторыі вынаходніцкіх машын Л. ЦЫБУЛЬКА; інжынер мінскай лабараторыі У. ШЧУРКО (першы злева) дзеліцца вопытам з дацэнтамі Маскоўскага энергетычнага інстытута Р. ГАЛУБЧЫКАМ і У. ЭТАМ.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

НАТАТКІ ПАЛІТОЛАГА

БЕЛАРУСЬ У ГЕАПАЛІТЫЦЫ

III. Палітыка і суайчыннікі

Неспадзяванасцю першых крокаў беларускай дыпламатыі з'явіўся зварот да праблемы беларускай меншасці за мяжой, у прыватнасці ў Польшчы. Для савецкай улады такой праблемы пасля 1939 года не існавала, і грамадская думка Беларусі нават адзвычаілася яе абмяркоўваць. І толькі людзі, якім асабіста даводзілася сустракацца з беларусамі Беласточчыны, маглі адчуць эмацыянальную напружанасць і палітычную складанасць гэтай тэмы.

Калі трохсот тысяч этнічных беларусаў, спрадвеку гаспадарыўшых на землях Падляшша, засталіся ў Польшчы ў выніку пасляваеннай дэмаркацыі граніцы паміж БССР і Польшчай. Большасць з іх прытрымліваецца праваслаўнай веры, традыцый і звычаяў нацыянальнай культуры, размаўляе на мясцовых дыялектах беларускай мовы. На працягу пасляваенных дзесяцігоддзяў антывысты беларускага нацыянальна-культурнага руху, не знаходзячы разумення з боку польскіх улад, шматразова зварталіся да ўлад СССР і БССР з просьбамі дапамагчы ў развіцці беларускай школы і мастацкай самадзейнасці на Беласточчыне, аслабіць пашпартныя перашкоды для сустрэч сваякоў, па абодва бакі граніцы і г. д. Рэдкая з гэтых просьбаў была пачута ў Мінску. Расчараванне абыякавасцю да сябе ў краіне, якую яны называлі сваёй другой Радзімай, адкладвалася ў сэрцах беластоцкіх беларусаў.

Не лепшым было становішча чатырохсот тысяч палякаў на Беларусі. Даўно былі зачынены польскія сельсаветы, школы, газеты. Дзеля фарміравання новай гістарычнай супольнасці — савецкі народ — метадычна вынішчалася нацыянальная камасядомасць палякаў, улада не збіралася рэабілітаваць сем'і, незаконна рэпрэсіраваныя ў гады сталінскага ліхалецця.

Былі артыкулы ў апазіцыйнай прэсе на карысць правоў беларусаў у Польшчы, прамовы на сходах, дэманстрацыя абструкцыі міністру замежных спраў Польшчы падчас яго першага візіту ў Мінск.

Усе гэтыя падзеі з іх супярэчнасцямі і складанасцямі нельга разглядаць інакш, як натуральныя крокі на шляху дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў былой вышэй даволе ўлад СССР на стварэнне польскіх нацыянальна - культурных аб'яднанняў: аб'яднанні рэкамендавалася рэгістраваць пры Таварыстве савецка-польскай дружбы. Тым самым савецкі ўрад ставіўся да савецкіх палякаў амаль як да чужаземцаў. Рэкамендацыі гэтыя ўсюды былі дружна праігнараваны (Саюз палякаў на Беларусі быў створаны напачатку пры Беларускім фонда культуры, а пазней адасобіўся). Тым не менш ідэя працягвае жыць: як сумнае яе праяўленне трэба адзначыць прыхільнасць да прынцыпу ўзаемнасці з боку ўрадавых і грамадска-палітычных колаў абедзвюх краін. Нагадвае гэта старажытныя звычаі радавой помсты.

Сучасны ўзровень цывілізацыі згладжвае ўсе промахі ў міжнацыянальных дачыненнях. Але пры ўмове, што дзяржаўныя і палітычныя структуры не будуць стымуляваць іх адраджэння. Адносіны да грамадзян Рэспублікі Беларусь небеларускай нацыянальнасці павінны быць толькі як да грамадзян Рэспублікі Беларусь, з улікам іх нацыянальна-культурных, рэлігійных і іншых законных інтарэсаў. Так, як гэтага патрабуюць міжнародныя пакты аб правах чалавека і так, як гэта ўмацавалася ў традыцыях і ментальнасці беларускага народа.

Прынцып узаемнасці не можа быць прымальным па маральных прычынах, немэтазгодны ён і па прычынах палітычных. Уявім сабе на момант сітуацыю, што ў нейкай суседняй краіне да ўлады прыходзяць, скажам, прадстаўнікі радыкальна-нацыянальных рухаў і рэзка змяняюць адносіны да нацыянальных меншасцей, у ніякай неабходнасці звязваць усё гэта з палітыкай урадаў замежных краін.

На жаль, іншы пункт гледжання дэманструе частка нашага грамадства, і нават народныя дэпутаты рэспублікі на апошняй сесіі меліся аб'яднаць у адной парламенцкай камісіі дзве, на іх погляд, вельмі блізкія праблемы: міжнародная палітыкі Рэспублікі Беларусь і міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Беларусь, і не зрабілі гэтага толькі з-за нейкіх персанальных альбо тэхнічных перашкод.

Варта мець на ўвазе і такія акалічнасці. Беларусы за мяжой нідзе не складаюць такой значнай долі жыхароў, як небеларусы ў Рэспубліцы Беларусь. Нашых суайчыннікаў сярод жыхароў Літвы і Латвіі недзе 2—3 працэнты, у Расіі і Польшчы — па адным працэнту ад колькасці ўсяго насельніцтва. Палякі ж і рускія сярод грамадзян Беларусі складаюць адпаведна 4 і 10 працэнтаў. Адсюль відаць, што роля беларусаў у грамадскім і эканамічным жыцці сумежных краін будзе заўсёды адрознівацца ад ролі нацыянальных меншасцей на Беларусі.

Забеспячэнне грамадзянскіх правоў і інтарэсаў нацыянальных меншасцей у Канстытуцыі і заканадаўстве Рэспублікі Беларусь, спрыяльны маральна-палітычны клімат для іх культурнага развіцця, міжнацыянальная згода ў Беларусі — важныя ўмовы добрасуседскіх адносін з іншымі краінамі, знешнепалітычнай стабільнасці, гарантыя таго, што міжнацыянальныя сувязі не справакуюць пагаршэння адносін з суседзямі і не падштурхнуць іх да ўмяшання ва ўнутраныя справы Беларусі, не станчць прычынай пагрозы яе суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці.

Справа ж беларускай дыяспары бачыцца незалежнай ад унутраных спраў Беларусі. Аб яе значэнні можа сведчыць ужо тое, што за межамі Беларусі, на Усходзе і Захадзе, жыве не менш адной трэці этнічных беларусаў. У свеце шмат прыкладаў, калі дыяспара актыўна дапамагае сваёй радзіме: адкрывае для суайчыннікаў шлях да замежных капіталаў і навейшых тэхналогій, адыгрывае лабісцкую ролю ў палітычных пытаннях, узбагачае нацыянальную культуру.

Вядома, што беларуская дыяспара не такая ўплывовая на Захадзе, як, скажам, яўрэйская, не такая кансалідаваная, як армянская, не такая актыўная, як польская. Не чуваць жа там аб беларускіх Ротшыльдах альбо Бжазінскіх. Але таму і не чуваць, што беларуская дыяспара ніколі не ведала ні маральнай, ні юрыдычнай, ні матэрыяльнай падтрымкі Радзімы.

Тым не менш працавітыя беларусы, што ехалі ў XIX і XX стагоддзях у Амерыку і Аўстралію, а таксама тыя, хто ўладкаваўся ў Заходняй Еўропе, знайшлі свае месцы ў сучаснай цывілізацыі і не выглядаюць там гаротнікамі. Зарабляюць сабе на жыццё, будуюць цэрквы і школы, выдаюць газеты, часопісы, з усяго свету збіраюцца на свае кангрэсы.

Абуджаецца нацыянальная свядомасць беларускіх мігрантаў, перасяленцаў у Расіі, Казахстане, на Украіне, тых, хто выехаў некалі на асваенне цалінных і абложных зямель, на работу ў шахтах і заводах, на будаўніцтва гідраэлектрастанцый, БАМа.

Беларуская дыяспара — гэта мільёны ніцей, якія звязваюць Беларусь з усімі часткамі свету, сусветнай скарбніцай гаспадарчага вопыту, прафесіянальных ведаў, сучаснай культуры, усім, чаго нам сёння вельмі бракуе. Але перш чым далучыцца да гэтага багацця, Беларусь павінна аддаваць даўгі сваім суайчыннікам за мяжой, адчыніць для кожнага з іх дзверы ў любы пакой бацькоўскага дома, забяспечыць ім сваю бацькоўскую апеку і там, на чужыне.

Леанід ЛОЙКА.

ВОЗГАЛАС POSTAWAC

КУРС ВАЛЮТЫ

па стану на раніцу 20 мая 1992 года

	Разменныя канторы банка «Комплекс», Мінск	Фірма «Рыга»
Долар ЗША	123—126	123—129
Марка ФРГ	72— 74	74— 79
Аўстралійскі долар	—	80— 98
Англійскі фунт	205—220	188—231
Фінская марка	22 — 24	23,6— 29
Шведская крона	20— 22	18 —21,9
Французскі франк	21— 23	19— 23
Дацкая крона	—	16,6— 20
Галандскі гульдэн	62— 66	58— 70
Канадскі долар	92 —102	87 —109
Швейцарскі франк	73— 80	70— 86
Аўстрыйскі шылінг	9— 11	9— 11
Італьянская ліра	0,08—0,09	0,07— 0,1
Японская іена	0,9	0,7— 1

Бела ПАН.

ГАРАЧЫ АБЕД — ЦЯПЕР НЕ ДРОБЯЗЬ

МІНСК. Мінгарвыканком прыняў рашэнне аб першачарговых мерах па сацыяльнай абароне малазабяспечаных пенсіянераў і інвалідаў.

Цяпер для адзінокіх састарэлых і інвалідаў, што атрымліваюць пенсію ў мінімальным размеры і ніжэй, а таксама для адзінокіх інвалідаў першай групы, якім патрэбна дапамога, будзе арганізавана бясплатнае харчаванне. Пры неабходнасці гарачыя абеды будуць дастаўляцца прама на дом. Мяркуецца таксама арганізаваць продаж тавараў па сацыяльна нізкіх цэнах, у тым ліку і паступаючых па лініі гуманітарнай дапамогі. Акрамя таго, разавымі талонамі на бясплатнае харчаванне ў парадку выключэння будуць забяспечвацца асобы, эвакуіраваныя з чарнобыльскай зоны, прыбыўшыя з месц пазбаўлення волі і ў некаторых іншых выпадках.

ЭКЗОТЫК-БІРЖА

Раз-пораз «Звязда» друкуе цэны на розныя прадукты харчавання і тавары. Але ўсё часцей у камерцыйных крамах і на рынках з'яўляюцца рэчы, якія да апошняга часу лічыліся экзатычнымі. Многія в нас, пражыўшы ўсё жыццё, так і не пабачылі многіх заморскіх фруктаў, а ўсялякія «заходнія» прылады мы лічылі «выбрыкамі загніваючай буржуазіі». Таму «Звязда» прапануе цэны на так званыя экзатычныя тавары і прадукты, якія адных шакіруюць, у другіх выклічуць скептычную ўсмешку, а трэцім дадуць падставы для роздуму.

Ананас — 1.000 рублёў за штуку.
Банан — 140 рублёў за кілаграм.
Ківі — 40 рублёў за штуку.
Какос — 170 рублёў за штуку.
Парасоны для кактэйляў — 5 рублёў за штуку.
Лазерны дыск — 300—600 рублёў.
Кансервы для сабак — 60 рублёў за бляшанку.
Тэстар для вымярэння стрэсу — 50 рублёў.
Музычная паштоўка — 10—30 рублёў.
Газавы балончык — 400—700 рублёў.

Путч і «зомбі»

ВЕРСІЯ

Памятаеце, некалькі месяцаў назад доктар філасофскіх навук, дацэнт МПДУ імя Леніна балгарын Тодар Дзічаў зрабіў сенсацыйную заяву аб тым, што ў перыяд з 19 па 23 жніўня мінулага года ахоўнікі «Белага дома» ў Маскве былі «замбіраваны», гэта значыць, супраць іх была праведзена псіхалагічная дыверсія. Як заявіў вучоны, менавіта з мэтай уздзеяння на псіхіку масквічоў тады ў Варне прышвартаваўся амерыканскі крэйсер «Бедкап», з борта якога вялося накіраванае апраменьванне псіхічнай энергіяй. Такая ж устаноўка быццам бы дзейнічала ў Маскве. Дзічаў сцвярджаў, што ўсе ахоўнікі «Белага дома» захварэюць у бліжэйшыя 3—5 гадоў, а яшчэ праз два гады памруць, калі з імі не будзе праведзена адпаведная работа. У заключэнне вучоны сказаў, што нашы лідэры — М. Гарбачоў і Б. Ельцын таксама падвергліся псіхічнай апрацоўцы: у 1983 і 1989 гадах адпаведна (у час іх візітаў у ЗША).

Здаецца, цяпер асобныя факты і сапраўды выклікаюць трывогу. Аналіз відэазапісаў жнівеньскіх падзей і характар паводзін нашых лідэраў, на жаль, пацвярджаюць найгоршыя прадказанні балгарына. Вельмі цікавым здаецца пажар, які адбыўся ў пачатку жніўня на верхніх этажах амерыканскага пасольства, куды ўпарта не хацелі пускаць нашых пажарных. Тады газеты спрабавалі здагадацца, у чым справа. Некаторыя вучоныя цяпер выказваюць здагадку, што гэта было самазапаленне апаратуры псіхатроннага ўздзеяння, якая пры малым ККД валодае вельмі вялікімі энергетычнымі затратамі. А як быць з баявымі машынамі пяхоты, што кіраваліся ў бок, процілеглы «Беламу дому», але якія ўсё роўна імкнуліся падпаліць? Паводле слоў Юрыя Маміна, дырэктара Цэнтра біямедтэхналогій, вельмі дзіўнымі выглядаюць паводзіны Барыса Ельцына. З пункту гледжання бяспекі і вопыту асабістай аховы значна зручней выступаць з балкона (дзе, дарэчы, ёсць і сістэма ўзмацнення гуку, і відаць лепш), а мы бачым яго на танку. Далей назіраецца апошняя фаза псіхалагічнага ўздзеяння: народ пачаў несвядома разбураць помнікі, якія не маюць да падзей ніякіх адносін.

Вядома, думку балгарскага і савецкага вучоных можна аспрэчваць. Але ўлічыце такі факт: з ліку паддоследных у вывучэнні ў 70-х гадах у Балгарыі псіхафізічнага ўздзеяння на арганізм чалавека ў жывых не засталося ніводнага. А гэта былі здаровыя мужчыны ўзростам за 36 гадоў. Даследаванні тады праводзіў Тодар Дзічаў. Вось адкуль яго «прароцтвы» аб хуткай смерці «ахоўнікаў» «Белага дома».

Кар. «Звязды».

ЛОЕЎСКАЯ ВАЛЮТА

ЛОЕЎ. Падобна, што пытанне сваіх грошай, над чым ламаюць галовы парламентарыі рэспублік СНД, сёння ўжо не турбуе жыхароў горада.

У магазінах з-за адсутнасці разменных грошай увялі ўласную валюту. Новаўвядзенне знайшло сваіх прыхільнікаў, таму што амаль ніякіх дадатковых матэрыяльных затрат ні ўлады, ні рацыяналізатары не нясуць. У магазінах цяпер замест рэшты даюць паперку з указаннем колькасці і подпісам прадаўца. Назбіраўшы пэўную суму, можна спакойна атаварыцца па гэтых цэтліках у сваёй краме. Праўда, ёсць адзін непрыемны нюанс для жыхароў горада: пайсці за пакупкамі можна толькі ў той магазін, прадавец якога выпісаў паперку, бо ў іншых за яе нічога не купіш.

ДАПАМОГ СПОНСАР

Пасля перапынку, выкліканага фінансавымі цяжкасцямі, зноў падняў заслону лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі народны драматычны тэатр «На Доўгім Бродзе» Дома культуры Мінскага трактарнага завода.

Гэта стала магчымым дзякуючы дапамозе спонсара — таварыства з абмежаванай адказнасцю «Аншлаг». Гледачы ўбачылі прэм'еру трагікамедыі славутага італьянца Эдуарда дэ Філіпа «Я — наследнік».

Так спонсар дапамог нанава нарадзіцца тэатру, ад якога адмовіліся «мецэнаты» з МТЗ. У дзень прэм'еры ўсе дзеці, якія прысутнічалі на спектаклі, атрымалі ў падарунак ад «Аншлага» па кніжцы твораў Марка Твэна.

КАМУ Ў ЛАТВІІ ЖЫЦЬ ДОБРА?

НАПЯРЭДАДНІ ЎВОДУ Ў ДЗЕЯННЕ ПАСТАНОВЫ АБ НАТУРАЛІЗАЦЫІ

Сказаць па праўдзе, апынуўшыся ў Латвіі, у прыватнасці ў яе сталіцы, перш за ўсё адчуваеш, што ты сапраўды за мяжой. І не столькі таму віной нейкія фактычна-юрыдычныя межы, якія ўтварыліся пасля набыцця прыбалтыйскімі рэспублікамі статуса самастойных дзяржаў, колькі звычайныя асацыятыўныя ўражанні. Напэўна, такія ж узнёслыя адчуванні перажывае турыст, волей лёсу трапіўшы ў Швейцарыю, Італію, Францыю...

Застаючыся патрыётам роднага краю, я, тым не менш, не рызыкую сказаць, ад чаго можа захапіць дух у замежнага госця, які наведаўся ў наш Мінск. Рыга — справа іншая. Вядома, гэта не датычыцца тых стылізаваных «каробак», якімі мы запоўнілі бязмежныя прасторы адной шостай часткі сушы. Але не ўсе народы бяздумна зносілі бясцэннае старое пад сумніцельнай якасці новае. На шчасце, «старая» Рыга на працягу стагоддзяў застаецца некранутай бяздушным бульдозерам. І можна быць упэўненым, што ёй забяспечана яшчэ доўгае жыццё.

Але і ў старым горадзе час не стаіць на месцы. Яго карэктывы адчуваюцца ва ўсім. Напрыклад, я, пабываўшы ў Рызе роўна год назад, убачыў на гэты раз розная роду новаўвядзенняў больш чым дастаткова.

Па-першае, уразіла незлічоная колькасць мяняльных валютных кантор, якія трапляюцца на вочы літаральна на кожным кроку. І пры гэтым купіць і прадаць валюту любой краіны можна зусім свабодна, без усялякіх замежных пашпартоў і адкрытых візаў (чаго ўсё яшчэ патрабуюць у нас). Калі ласка, прыходзь і рабі свае «валютныя махінацыі» на вачах у дзяржавы і закона. Трэба сказаць, крок вельмі дальнабачны. Менавіта з гэтага і пачынаецца ўнутраная канвертацыя любой валюты. Для разумення з'явы можна прывесці да болю знаёмую аналогію з Польшчай.

На фоне традыцыйнай прыбалтыйскай — і таму, зразумела, зайздроснай — чысціні няцяжка заўважыць яшчэ адну «масавасць». На гэты раз аб'ектам пільнай увагі любога «эсэндэшніка» з'яўляецца прыкметна абноўлены аўтапарк прыватных машын. І, дарэчы, дамінуюць ужо не «Жыгулі» і «Масквічы», а маркі больш грунтоўныя. І здзіўляцца тут няма чаму. У той час як Тальяці, насуперак усім законам здаровага сэнсу, прадаўжае накручваць віткі цэнаў на свае «ВАЗы» (некалькі дзён назад у выніку чарговага скачка «Жыгулі» падняліся да паўмільённай рысы), для многіх аўтааматараў куды прасцейшай задачай стала набыццё машыны далёка за сферай уплыву былых манапалістаў з Масквы, Тальяці або Ніжняга Ноўгарада. Дарэчы, з меншым размахам, але падобная сітуацыя назіраецца і на беларускім аўтарынку. Праўда, адно «але»...

У адрозненне ад нашых пакупнікоў, якіх зусім мала цікавіць стан і знешні выгляд «сродку перамяшчэння», латышскія аўтааматары прэтэндуюць толькі на сусветна вядомыя маркі з гучнымі назвамі. Па праўдзе, і магчымасцей для гэтага ў іх куды больш. А новенькія «BMW» «форды», «мерседэсы», трэба сказаць, даволі ўдала ўпісваюцца ў агульны фон цудоўнага старадаўняга горада.

Вось толькі апошнім часам уладальнікам зайздросных іномарак усё часцей прыходзіцца ламаць галаву над тым, чым «карміць» свайго любімца. Напрыклад, А-76 вось ужо месяц можна набыць толькі ў адным месцы па «звычайнай» цане — 18 руб. за літр. Крыху большы выбар А-93 і А-95, але адпаведна і за большыя «бабкі» — ад 21 да 24 рублёў. Трэба сказаць, што пэўны дыскамфорт адчуваюць не толькі машыны. Цяжка быць да канца шчаслівым, калі бохан хлеба каштуе 8 рублёў. І ўсе разумеюць, што гэта яшчэ не мяжа, бо амаль кожны дзень прыносіць звесткі аб чарговым падражанні энерганосьбітаў. Спытаеце, якая тут сувязь? Для работы хлебных печаў патрабуецца немалая колькасць прыроднага газу, які Латвія «качае» далёка па-за сваімі межамі. Расія патрабуе валютных разлікаў...

Разам з нафтавымі рэкамі мялеюць і некаторыя іншыя. З пачатку мая за кожны ўвезены ў Латвію літр гарэлкі трэба будзе заплаціць 100 рублёў (за спірт — 200 рублёў). Закон распаўсюджваецца як на юрыдычных, так і на фізічных асоб, праўда, для апошніх прадугледжана выключэнне: асобам, дасягнуўшым 21 года, дазволена ўвозіць адзін літр харчовага спірту, гарэлкі або гарэлачнага вырабу без аплаты пошліны. Але, на думку спецыялістаў, наўрад ці ўвядзенне гэтай пошліны акажацца дзейсным, паколькі латвійская мытня і без таго не спраўляецца з кантролем на межах рэспублікі. Цяпер ёй прыйдзецца правяраць і аўтатранспарт, які накіроўваецца ў Латвію. І другое: магчымае павышэнне цэн на ўвозімы алкаголь пацягне за сабой скарачэнне аб'ёмаў яго рэалізацыі, а гэта, у сваю чаргу, — скарачэнне адлічэнняў і ў дзяржаўны, і ў валютны бюджэт. Вось так. Як кажуць: ніхто не ведае, дзе згубіш і дзе знойдзеш. Варта толькі дадаць, што зараз кошт адной бутэлькі гарэлкі ў магазінах Рыгі вагаецца ад 130 да 150 рублёў.

Так, цэны кусаюцца, і прытым — на ўсё. І ўсё-такі пухнуць ад голаду ніхто не збіраецца, бо паліцы гандлёвых кропак літаральна ломяцца ад прадуктаў. Дзеля справядлівасці: настолькі ж яны ломяцца і ад тых жа цэнаў. Затое латышскі пакупнік пазбаўлены «задавальнення» ад тысяч паперак накшталт візітак, талонаў, купонаў і г. д.

І тым не менш сёння не толькі, нават не столькі цэны цікавяць насельніцтва Латвіі. Ёсць на парадку дня пытанні куды больш актуальныя. У прыватнасці, 5 мая пачынаецца выдача жыхарам рэспублікі... рознакаляровых пашпартоў у залежнасці ад прынятага, а дакладней, уручанага зверху грамадзянства (блакітныя — грамадзянам Латвійскай рэспублікі, карычневыя — усім астатнім, не падпадаючым пад заканадаўчыя акты).

Увогуле, вакол праблемы грамадзянства на працягу ўсяго падрыхтоўчага перыяду ўзнікала мноства міфаў і недакладнасцей. Але ўсё дастаткова элементарна. Адносіны, у якія ўступаюць паміж сабой дзяржава і яе насельнікі, рэгламентуюцца пастановай ВС Латвійскай рэспублікі «Аб аднаўленні правоў грамадзян Латвійскай рэспублікі і асноўныя ўмовы натуралізацыі», называемай у народзе проста пастановай аб натуралізацыі, а таксама канстытуцыйным Законам «Правы і абавязкі чалавека і грамадзяніна».

Пастанова вярнула грамадзянства Латвійскай рэспублікі яе грамадзянам да 1940 года і іх нашчадкам і вызначыла тых жыхароў Латвіі, якія пры выкананні пэўных умоў (веданне мовы, цэнз, клятва і г. д.) могуць стаць грамадзянамі рэспублікі. Трэба, аднак, падкрэсліць, што пастанова аб натуралізацыі не з'яўляецца дакументам, надзяляючым жыхароў Латвіі нейкімі правамі. Гэты дакумент, як ні дзіўна, проста пазбаўляе грамадзянства значную колькасць насельніцтва рэспублікі. Ёсць, праўда, афіцыяльная агаворка: Латвійская ССР аб'яўлена ніколі не існаваўшай. Але тады на якой прававой базе функцыяніруе Вярхоўны Савет?

Чакаемы закон аб грамадзянстве будзе рэгламентаваць атрыманне грамадзянства асобамі, якія на 1 ліпеня 1992 года не маюць магчымасці, у адпаведнасці з пастановай аб натуралізацыі, стаць грамадзянамі Латвіі. Дарэчы, у «неграмадзян» не будзе права выбірацца і быць выбранымі ў парламент, яны не змогуць аб'яднацца ў партыі, не змогуць займаць дзяржаўныя пасады, не могуць мець у прыватнай уласнасці зямлю, нават для ўзвядзення вытворчых магутнасцей, што ў сваю чаргу абмяжоўвае прадпрымальніцтва «неграмадзян». Для іх захоўваецца інстытут прапіскі, і свабодна перамяшчацца яны могуць толькі ў межах рэспублікі. Вось такія, што чазываецца, незайздросныя перспектывы чакаюць даволі значную частку насельніцтва свабоднай і незалежнай Латвіі.

Хацелася б, каб на вопыце паўночных суседзяў мы, у сваю чаргу, не нарабілі аналагічных памылак. Бо ў рэшце рэшт зусім не выключаны масавы выхад «непатрэбных», «другасортных» людзей да замежных пасольстваў з патрабаваннем прадастаўлення ім статуса палітычных бежанцаў. Наўрад ці гэта прыдасць аўтарытэту любой краіне, асабліва калі яна робіць неабдуманыя крокі ў самым пачатку свайго новага жыцця.

Але пакуль што палітычныя амбіцыі ў эшалонах улады мала адбіліся на звыклым цячэнні жыцця па-за свядомасцю людзей, якім больш па душы прыйшоўся б нулявы варыянт грамадзянства (яго ў свой час прапаноўваў Народны фронт Латвіі).

З надыходам вясны людзі менш за ўсё хацелі б займацца палітыкай. І як пацвярджэнне таму — даволі інтэнсіўнае культурнае жыццё рыжан. У апошнія выхадныя красавіка тут прайшоў — у будучым, хутчэй за ўсё, апальны — рускамоўны міжнародны фестываль-конкурс сатыры і гумару «Мора смеху-92» на кубак вядомага рыжаніна Аркадзя Райкіна. Другі конкурс — «Міс Латвія» не патрабуе павальнай латвінізацыі, але ці да яго будзе дзяўчатам, маральна прыгнечаным асэнсаваннем уласнай «другасортнасці»? Трэба было бачыць, як весяліліся жыхары горада і госці рэспублікі ў час святкавання праваслаўнага Вялікадня. Няўжо праз год нешта можа змяніцца?

Так, шмат пытанняў, адказаць на якія можа толькі час. Але хацелася б, каб у дарозе яго суправаджаў яшчэ і здаровы сэнс. Інакш усе прыгажосці цудоўнай Рыгі будуць мізарнець у зацьменні ўзаемных канфрантацый. Але будзем спадзявацца, што да гэтага справа не дойдзе.

Ігар КАРНЕЙ.

Рыга—Мінск.

Не ў шыльдзе справа

Вы ніколі не задумваліся над тым, чаму ў нашай рэспубліцы застаецца ўсё менш і менш інстытутаў? Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут стаў Беларускай акадэміяй мастацтваў, інстытут фізічнай культуры — акадэміяй фізічнага выхавання і спорту, інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі ператварыўся ў Беларускі аграрны тэхнічны універсітэт, інстытут народнай гаспадаркі—у эканамічны універсітэт, політэхнічны інстытут — у політэхнічную акадэмію. Маюць намеры павысіць свой статус іншыя мінскія ВНУ, напрыклад, мед- і педінстытуты. Такая ж тэндэнцыя на перыферыі.

Адміністрацыя былых інстытутаў тлумачыць перамены назіраннямі за структурай вышэйшай адукацыі краін Заходняй Еўропы і ЗША, дзе ў асноўным выкарыстоўваецца сістэма універсітэтаў. Не сакрэт, што кіраўніцтва беларускіх інстытутаў у былыя гады часта наведвала думка аб прэстыжы універсітэцкай адукацыі. Таму ўзнікла своеасаблівая зайздрасць да БДУ і Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў Горках, якія ўжо адным сваімі назвамі сімвалізавалі нейкую рэспектабельнасць. І вось такія ж красамоўныя «тытулы» атрымалі адзін за адным амаль палавіна інстытутаў Беларусі.

Што змянілася? Дакладна вядома — толькі «грашовы» аспект. Адміністрацыя інстытутаў добра ведала, што стаўкі прафесарска-выкладчыцкага саставу ва універсітэтах і асабліва ў акадэміях, па існуючай тарыфнай сетцы значна вышэйшая. У першую чаргу менавіта гэты фактар паслужыў прычынай хуткага пераходу пад новую шыльду. Аднак якасць навучання ад гэтага не палепшылася, матэрыяльная база не ўмацавалася, а студэнты адчуваюць навізну сітуацыі толькі ад тых новых шыльдаў.

Хутка, напэўна, будзе час, калі інстытутаў на Беларусі наогул не застанецца, і тады Беларускаму дзяржаўнаму універсітэту (які да гэтага часу лічыцца флагманам беларускай навукі) прыйдзецца ператварацца ў інстытут, каб хоць нечым адрознівацца ад «калег».

Кар. «Звязды».

«Уцечка мазгоў» пад пагрозай?

КАМЯНЕЦ (Ю. Фёдарава). Мара многіх вучоных — хутчэй укараніць свае распрацоўкі ў жыццё. А, як вядома, дзяржаўныя прадпрыемствы не заўсёды хуткаўспрымальныя да навукі.

І вось —зайздросны прыклад. На Брэстчыне паспяхова працуе навукова-вытворчы кааператыў «Вектар». Сталічныя вучоныя перадалі яму шэраг сваіх тэхнічных распрацовак. Кааператыў у ліку іншых патрэбных рэчаў вырабляе прафесіянальныя дазіметры, цеплатэхнічныя прыборы.

І што цікава: офіс кааператыва, які так сябруе з навукай, размешчаны не ў горадзе, а ў вёсцы Селішча, недалёка ад Белавежскай пушчы.

ВЕСТКІ АДУСЮЛЬ

НЯЎДАЛАЯ СПРОБА ПАТРЫЯТЫЗМУ

Не ўдалося праславіцца патрыётам матросу Балтыйскага флоту, азербайджанцу Закіру Уршудаву, які дэзерціраваў ў Нагорны Карабах. Праз некалькі дзён пасля ўцёкаў яго зловілі ўласныя браты і прывезлі ў воінскую часць. Перадаючы дэзерціра камандзіру, старэйшы брат «патрыёта» сказаў: «Пакуль у Азербайджане ваююць, яму там няма чаго рабіць».

ЗВАЖЦЕ МНЕ АЛІГАТАРА

Актыўным распродажам жывёлін пачаў займацца Калінінградскі заапарк, дарэчы, адзін з буйнейшых у Еўропе. «Браты нашы меншыя» просяць есці, а даць ім няма чаго з-за адсутнасці грошай. Асаблівым попытам карыстаюцца папугаі і чарапахі. Апошнія, напэўна, у суп.

У ТРЫДЗЕВЯТЫМ ЦАРСТВЕ...

Згодна з паведамленнямі з Чачэнскай Рэспублікі, яе прэзідэнт генерал Джахар Дудаеў, змагаючыся за нацыянальнае адраджэнне свайго народа, памяняў прозвішча з рускага на мусульманскі лад. Цяпер генерал афіцыяльна называецца Яго Правасхадзіцельства Мусі Дудзі Джахар. З гэтым новым імем Яго Правасхадзіцельства знаходзіцца цяпер пад нацыянальным бела-зялёным сцягам і гербам з адзінокім выючым ваўком.

КАРТЫ — АЗАРТНАЯ ГУЛЬНЯ. АСАБЛІВА ПАЛІТЫЧНЫЯ

Набірае сілу міжнародны скандал, звязаны з апублікаваннем новай карты Латвійскай Рэспублікі з пазначаным на ёй Пыталаўскім раёнам Пскоўскай вобласці як тэрыторыі, што належыць Латвіі. Як паведаміў адзін з кіраўнікоў Дэпартамента геадэзіі і картаграфіі, яны ўжо з самага пачатку ведалі, што з'яўленне падобнай карты выкліча адпаведны міжнародны рэзананс, асабліва ў сувязі з падпісаннем Анатолем Гарбуновым дакументаў аб уступленні Латвіі ў СБСЕ і пацвярджэннем непарушнасці пасляваенных граніц. Аднак латвійскія картографы гатовы дастойна сустрэць негатыўны ўсплёск міжнароднай грамадскасці, бо маюць дакументы, па якіх з'яўленне на геаграфічнай карце Абрэнскай воласці (а менавіта так назвалі Пыталаўскі раён) было санкцыянірана Вярхоўным Саветам.

Фірма венікі не вяжа

ГОМЕЛЬ. Гэты афарызм прыгадваецца, калі знаёмішся з фірменным гандлем мясапрадуктамі ў абласным цэнтры, які наладжаны прадпрыемствамі камітэта па сельскай гаспадарцы і харчаванню.

У розных канцах горада ўжо дзейнічаюць шэсць такіх гандлёвых кропак ад Гомельскага і Калінкавіцкага мясакамбінатаў і Гомельскай бройлернай птушкафабрыкі. Хутка ў Чыгуначным раёне будзе адкрыты яшчэ адзін такі магазін — на гэты раз ад Жлобінскага мясакамбіната.

ХАЙ ПАСВЯТЛЕЮЦЬ НАШЫ ДУШЫ!

ГОМЕЛЬ, 20. (Кар. БЕЛТА Віктар Котаў). Гісторыкі і летапісцы, напэўна, не абыдуць увагай сённяшні дзень. Бо кім бы мы ні былі, веруючымі або атэістамі, сам факт прыбыцця на беларускую зямлю нязгаснай Лампады, запаленай ад святога агню ля Труны Гасподняй у Іерусаліме, — падзея вялікай значнасці: агеньчык надзеі з радзімы хрысціянства да нас прыйшоў упершыню.

Дарога нязгаснай Лампады, якая пралегла праз гарады, што далі свету духоўнасць і цывілізацыю, прывяла ў Гомель. Позняй ноччу свяшчэнную працэсію сустракалі на граніцы Беларусі з Украінай. Урачыстыя прамовы гучалі на рэлігійнай літургіі, якая адбылася сёння раніцай у гомельскім саборы святых Паўла і Пятра.

— Мы доўга былі абдзелены духоўнасцю, — сказаў карэспандэнту БЕЛТА епіскап Гомельскі і Мазырскі Арыстарх. — Але ёсць вялікая надзея, што сённяшняя падзея аб'яднае веруючых, абудзіць у іх душах дабрату, паселіць у іх святло і любоў да людскога роду.

Пасля прыёму суправаджаючай дэлегацыі ў аблвыканкоме нязгасная Лампада ўзяла курс на Мінск.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

СЛАВЯНСКАЯ ПІСЬМЕНСТВА І СЛАВЯНСКІ ХРЫСТ
БЕЛАРУСКІ ФОНД

РАДЫЁ ПЕРАХВАТ

РАДЫЁ «СВАБОДА»

★ Прэзідэнт Малдовы Мірча Снегур заявіў, што падраздзяленні дыслацыраванай у Малдове 14-й арміі СНД пачалі займаць раёны левабярэжжа Днястра. У аўторак позна вечарам Снегур выступіў па нацыянальнаму тэлебачанню са зваротам да грамадзян рэспублікі і заклікаў іх усімі сродкамі садзейнічаць адпору агрэсарам. З такімі ж абвінавачваннямі ў адрас узброеных сіл СНД у аўторак выступілі і іншыя кіраўнікі Малдовы. Расія, пад чыю юрысдыкцыю перайшла 14-я армія, заяўляе, што армія не становіцца на чый-небудзь бок у гэтым канфлікце. Між тым, прэзідэнт Румыніі Іон Іліеску, які завяршыў свой візіт у Кішынёў, заявіў, што Румынія, Украіна і Расія будуць працягваць пасрэдніцкія намаганні, накіраваныя на мірнае ўрэгуляванне сітуацыі ў Прыднястроўі. У ходзе яго візіту падпісаны шэраг румына - малдаўскіх пагадненняў.

★ Прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын сустрэўся ў Маскве з прэм'ер - міністрам Украіны Вітольдам Фокіным. Абмеркаваны пытанні двухбаковых адносін, праблемы СНД. Ельцын і Фокін абмеркавалі ход эканамічных рэформ, пытанні кантролю над узбраеннямі, становішча ў Малдове, вынікі нядаўняга візіту прэзідэнта Украіны Леанида Краўчука ў ЗША, маючы адбыцца візіт у Вашынгтон прэзідэнта Расіі... Фокін выказаў занепакоенасць скарачэннем паставак расійскіх тавараў і сыравіны на Украіну, а таксама выдадзеным на гэтым тыдні расійскім прэзідэнтам указам аб павышэнні цэн на паліва.

★ Міністр замежных спраў Расіі Андрэй Козыраў перапыніце свой візіт у былыя рэспублікі Югаславіі і вяртаецца ў Маскву ў сувязі з неадкладнымі абставінамі. Козыраў правёў перамовы з кіраўніцтвам Сербіі і Чарнагорыі. Расійскі міністр заявіў, што прадоўжыць сваю паездку праз некаторы дзень.

★ Учора ў Бруселі пачалася арганізаваная НАТО нарада па канверсіі абаронных прамысловасці. У ёй прымаюць удзел прадстаўнікі краін — членаў НАТО, усходнееўрапейскіх дзяржаў і былых рэспублік Савецкага Саюза.

«БІ-БІ-СІ»

★ У Тайландзе працягваюцца хваляванні і дэманстрацыі пратэсту супраць урада. Тысячы прыхільнікаў апазіцыі выйшлі на вуліцы і плошчы. Строга асуджаюцца забойствы цывільных людзей вайскоўцамі. Асабліва актыўнасць праяўляюць студэнты, якія блакіравалі вялікі ўчастак асноўнай магістралі сталіцы Тайланда.

★ Турцыя выказала рэзкую крытыку ў адрас Арменіі за захоп азербайджанскага горада Лачын на поўдзень ад Нагорнага Карабаха. Ва ўраданай заяве сказана, што Арменія стала на шлях экспансіяністкай палітыкі ў адносінах да сваіх суседзяў. Армянскія ўлады тлумачаць захоп Лачына як неабходную меру для забеспячэння насельніцтва Нагорнага Карабаха харчаваннем.

★ У Баку парламент аб'явіў аб самароспуску, перадаўшы ўсю ўладу Нацыянальнаму савету.

★ Улады Малдовы заявілі, што ў выніку нядаўняга ўзброенага сутыкнення паміж сіламі, вернымі ўраду, і рускамоўнымі сепаратыстамі ў Прыднястроўі загінула каля 20 чалавек. Ваі ў асноўным вяліся ў раёне горада Дубасары.

★ Прэзідэнт Расіі Барыс Ельцын назначыў армейскага генерала Паўла Грачова новым міністрам абароны Расійскай Федэрацыі. Генерал Грачоў прымаў удзел у ваенных акцыях у Афганістане і падтрымаў Ельцына ў час жніўневскага путча.

«ГОЛАС АМЕРЫКІ»

★ Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў правёў перамовы ў Белым доме з прэзідэнтам ЗША Джорджам Вушам па пытаннях скарачэння стратэгічных ядзерных узбраенняў. Дагавор аб скарачэнні гэтых узбраенняў прадугледжвае рэзкае скарачэнне ядзерных арсеналаў. Вашынгтон разглядае падтрымку гэтага дагавора чатырма ядзернымі дзяржавамі былога Саюза ССР — Расіяй, Украінай, Беларуссю і Казахстанам — як істотную ўмову яго ратыфікацыі амерыканскім кангрэсам. Лідэры Казахстана і Злучаных Штатаў выказалі надзею, што пагадненне, падпісанае Назарбаевым з нафтавай карпарацыяй «Шаўрон», пакладзе пачатак новым амерыканскім інвестыцыям у эканоміку Казахстана.

★ Чэха-Славакія з узрушэннем адрэагавала на афіцыйнае паведамленне венгерскага ўрада аб тым, што ён прыняў рашэнне не прымаць удзелу ў сумесным будаўніцтве гідраэлектрастанцыі на рацэ Дунай. Чэха-Славакія заявіла, што такое рашэнне можа нанесці вялікі ўрон адносінам у Цэнтральнай Еўропе.

★ Паводле даных Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, з пачатку югаслаўскага канфлікту свае жылыя месцы пакінулі звыш мільёна мірных бежанцаў, з іх 700 тысяч — жыхары Босніі і Герцагавіны.

● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ ● РАДЫЁПЕРАХВАТ

АД АЎТАРА

Шмат было пературбацый на нашай зямлі ў XX стагоддзі. Рэвалюцыі, войны і, безумоўна, перабудовы. Бо, як высвятлялася, «пабудовы» нашы ранейшыя атрымліваліся нейкімі няўдалымі. Іх трэба было, — нам так казалі заўсёды,—бурыць-ламаць не шкадуючы, і, здавалася, калі мы яшчэ разок падпаціснем, светлае заўтра можа настаць сёння вечарам?.. Але як жа без запеўні? Ну, гэта для нашых лідараў была не праблема.

1985 год. Новы генсек сказаў, як адсек: жыць так, як мы жылі раней, нельга. Хто за рэвалюцыйныя пераўтварэнні?.. Усе як адзін! А з чаго пачнём?.. «Партыя нам скажа...» —так разважалі многія, бо думаць інакш было нельга, ды і разважаць самастойна многія адвучыліся.

Месяц май... «У Цэнтральным Камітэце КПСС: аб мерах па пераадоленню п'янства і алкагалізму». Потым ужо — у Савеце Міністраў, Прэзідыуме Вярхоўнага Савета...

І — працэс пайшоў. Распачалася чарговая барацьба. З кім, з чым? Ды гэта ўжо іншая справа. Галоўнае, якім чынам і якімі метадамі.

Заводы з дарагім абсталяваннем пайшлі на злом. Піўзаводы — таксама. На тысячах гектараў высякалася вінаградная лаза. Трушчылі/пустыя, але ўсё роўна распраклятушчыя-бутэлькі. Зніклі з твару зямлі піўбары і пабудовы адпаведнага профілю.

Працэс ішоў далей і глыбей.

Суровая ўстаноўка была дадзена міліцыі, і гандлю, і журналістам, і кінематаграфістам, і літаратарам. А тых, хто заязджаў у лясок і пераграваў у стол капот машыны, вылоўлівалі з дапамогай верталётаў. Своеасаблівы падыход быў і да камуністаў. Нічога дзіўнага: барацьба (яшчэ раз — барацьба!) за чысціню радоў працягвалася. Чыстыя адгароджваліся ад нячыстых, быццам бы ўздымаючы тым самым свой рэйтынг.

І ўсё ж не гэта галоўнае. У многіх і многіх людзей, не п'яніц, не алкаголікаў, набірала моцы крамольная думка: «дубовымі» мерамі і метадамі вырашаліся жыццёвыя пытанні і праблемы раней, гэтаксама вырашаюцца і зараз. Не будзе нашым бедствам канца краю. І не ў п'янстве тут справа, яно сапраўды — зло, але трэба глядзець шырэй...

Той, хто знойдзе час цалкам пачытаць аповесць «Дзень святога Валянціна», спадзяюся, зразумее аўтара. Пісалася яна не сёлета, і не летась. Апошнія праўкі, праўда, уносіліся ў пачатку 1991 года. Тады ж рукапіс зборніка пад назвай «Кветка кактуса» і быў здадзены ў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Атрымаў вось карэктуру. Чытачоў «Звязды» прашу зразумець аўтара, чаму ён не абнаўляў, не перайначваў асобныя месцы. Заднім, як кажуць, розумам, жыць і разважаць лягчэй. Пісаць — таксама...

Васіль НАЙДЗІН

ДЗЕНЬ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА

Урыўкі з аповесці

Якая ў вёсцы пошта? Задрыпанае аддзяленне! Загадчыца і дзве паштаркі. З доўгімі языкамі. І моцным нюхам на сакрэтную інфармацыю і канфідэнцыяльную перапіску. Дзякуючы іменна паштавікам Валянціна празвалі ў вёсцы «эсэрам». Так-так, эсэрам! За кантакт — у сэнсе перапіскі — з Сялянскім саюзам і Саюзам аграрнікаў. Больш таго. Ужо хадзілі плёткі, што ён, Рубанюк, з'яўляецца тайным арганізатарам сялянскай партыі і меціць у яе лідэры. Каб зручней дзейнічаць і дом у вёсцы купіў пад дачу, свіней, курэй завёў для прыкрыцця, значыць—для канспірацыі.

А суседцы Парасцы дом іх, з невялікім участкам — дваццаць няпоўных сотак,— не даваў спакою ні днём, ні ўначы. Рубанюкі наогул баяліся, каб яна іх не спаліла. Пра чырвонага пеўня суседка ўжо неяк выказвалася.

— Гарадской кватэры ім мала,— бубніла Параска.— Усё б заграблі...

— Законы мы не парушалі,— культурна апраўдваліся Валянцін і яго жонка — Валянціна.— Цяпер дазволена. Хоць ты і гараджанін, можаш купляць у вёсцы дом. Зямлю бяры...

— Вось іменна. Ды нашы вярхі ўсё б аддалі. І Германію, і Кубу... Там — ампірыялістам, тут — кулакам! Няма на вас Іосіфа. Вісарыёнавіч навёў бы парадак...

Так вось і накоплівала ў сабе дурную энергію не вельмі разумная Параска. А калі аднойчы куры Рубанюкоў апынуліся ў агародчыку — не ўгледзелі, факт,— зусім суседка адпусціла тармазы.

— Фермеры знайшліся!..— крычала яна.— Арындатары!.. Не сядзелася ў горадзе, сюды прымчалі. Ведаем мы... На калгасную зямельку, палітую крывёю і потам нашанскім, нацэлілі...

— Працуем жа... Ад цямна да цямна,— яго Валянціна аж заплакала.— У магазінах амаль не бываем, усё сваё... Падмога дзяржаве, усяму народу.

— Ах, каб на вас!.. Пра народ яны думаюць. За курамі сваімі ўгледзець не могуць, а лезуць у хвермеры...

Валянцін у гэты момант у хлеўчуку карміў кабанчыкаў і ўсё чуў. А праз маленькае акенца — бачыў. У яго спачатку з'явілася жаданне выбегчы і растлумачыць суседцы, па якім такім праве яны жывуць тут, няхай сабе і наездамі. Але хутка астыў. Няхай балабоне. Жонку толькі шкада.

— ...Не будзе тут часу гарэлку жлукціць! Ды й выцвярэзніка ў нас нямашака...

Ён выдатна разумеў, куды гне суседка.

***

У вёсцы, дзе Рубанюкі купілі, як у народзе кажуць, пад дачу дом, не сакрэтам было і тое, што Валянцін сапраўды аднойчы трапіў у выцвярэзнік. У горадзе сваім, канечне. Працаваў ён тады на буйным заводзе рэзервуўшчыкам. Зарабляў няблага. Сына, дачку гадавалі. Кватэра — трохпакаёвая. Праўда, каапаратыўная, але затое гадоў дзесяць жылі яны з Валянцінай як людзі. У адрозненне ад іншых, хто чакае дзяржаўную і стаіць у чарзе на жыллё пятнаццаць, а то і больш гадоў.

І вось у адзін цудоўны момант жыццё паказала яму зубы. У самы разгар антыалкагольнай кампаніі.

Адобрылі, ухвалілі, значыць, яны ў сваім цэху — на адкрытым партыйным сходзе—той гістарычны Указ. У курылцы з яго пасмяяліся і — за заводскія вароты. Па дарозе дамоў некалькі бутэлек піва купілі. У рыбным магазіне цюльку давалі — трыццаць капеек за кілаграм. Паўкіло ўзялі. На выступе падмурка шматпавярховага дома, за газетным кіёскам, прыладзіліся. Адкаркавалі бутэлькі з «Жыгулёўскім». У рот па рыбцы закінулі. Прылабуніліся...

Тут як тут — два міліцыянеры. Маладзенькія, малако на губах не абсохла. Курсанты, здаецца. Але яршыстыя, не давядзі ты Бог.

— Што вы тут робіце? — пытаюцца.

«Пітні» стаяць, усміхаюцца.

— Ды вось... Піўко... Свежанькае...

— І пралетарская закусь. Трыццаць капеек за кілаграм,— узмацніў тлумачэнні Сяргей, сябра Валянціна.

— П'янствуеце, значыць, на вуліцы!..

— Вы што... Ніякага няма ў нас спіртнога,— дадаў і Валянцін.— Самі ж бачыце.

— Вось мы і бачым,— міліцыянеры-яршы пачалі прыглядацца да іх кішэняў.

— Пустыя! — Валянцін без усялякай задняй думкі засунуў рукі ў абедзве свае кішэні штаноў і вывернуў іх.— Няма нічога. Як заўсёды ў пралетарыяў...

Сябры зноў засмяяліся. А Раман тым часам паведаміў, што ў яго кішэнях цэлы скарб — сцізорык, пачак «Астры» і металічны рубель.

— Жартаваць з намі задумалі! — На міліцыянераў найшла яшчэ большая суровасць.— Быццам бы не ведаеце, што па новым Указе піва таксама з'яўляецца алкагольным напіткам. Хоць слабым, але алкагольным. А за распіццё іх у грамадскіх месцах — на вуліцах, у парках, скверах...

— Ды вы што, хлопцы!..

— Знайшлі «хлопцаў»... Вось вы, вы і вы,— адзін з міліцыянераў паказаў на Валянціна, Сяргея і Рамана.— Пройдземце з намі.

Страж парадку злёгку пацягнуў Рубанюка за рукаў. Валянцін тузануў руку назад. Міліцыянер ухапіўся за яе мацней. І кінуў свайму напарніку:

— Хопіць з імі, алкаголікамі, важдацца! Выклікай дзяжурную машыну...

***

У «прылазніку» выцвярэзніка за жоўтым пашарпаным сталом сядзеў магутнай камплекцыі капітан. Ён нешта пісаў у тоўстым журнале. У акенца высунуў галаву чалавек у белым халаце — не то доктар, не то санітар:

— Гэтыя ж, здаецца, яшчэ нармальныя...

— Ведаеш ты...—узняў галаву капітан,— Дарма мае стараліся?.. Малайцы, хлопцы! Уй, малайцы...

З гэтых яго слоў цяжка было зразумець, хто — малайцы? Міліцыянеры ці яны, «парушальнікі» правапарадку, сілком дастаўленыя ў гэтую ўстанову.

— Арлы!.. Калістратавіч,— звярнуўся капітан да доктара-санітара.— Нехта там зноў бушуе. Схадзі супакой.

— Зараз будзе ціха...— запэўніў Калістратавіч.

— Ну, а што гэтыя вытваралі сокалы? Дакладвайце.

Міліцыянеры наперабой пачалі тлумачыць: як, дзе і калі рабілі затрыманне.

Малюнак атрымаўся жудасны.

На стол капітана ляглі як рэчавыя доказы партатыўная рацыя з парваным рамянём і тры гузікі з форменнага адзення.

Валянцін са свайго боку зрабіў спробу паказаць капітану напалавіну адарваны рукаў.

— Цудоўныя вы хлопцы! І здаровыя,— зноў немаведама да каго звярнуўся гаспадар кабінета-прылазніка.— А дзе гэта піва прадаецца?.. Тыдзень шукаю, не магу папіць. Пасля работы, канечне. І не на вуліцы, як асобныя нашы кліенты. Не ў парку, не ў скверы... Нічога вы, хлопцы, не разумееце. У вялікай палітыцы. І не разумелі...

— Абсалютна! — спакойным голасам сказаў Раман і адвёў абедзве свае рукі за спіну.

— Дзе вам ужо зразумець?! Прапілі мазгі. Алкаголь, хлопцы, у першую чаргу дзейнічае на галаву, а потым — на ўсё астатняе. Гэта такі опіум — горш за рэлігію... Опіум для народа! Не чыталі класікаў?..

Валянцін цяжка ўздыхнуў і, узняўшы галаву, пачаў разглядаць столь.

Сяргей наогул адышоў крыху ўбок і без запрашэння сеў на стул.

— Дубы!.. Па літру могуць кульнуць, і не ў адным воку. А мабыць, уцягнуўся народ? Разгуляўся. Быццам бы перад пагібеллю якой...

— Кроплі ў роце не было! — Валянцін глядзеў капітану прама ў вочы.— Акрамя піва...

— Так-так-так... — ацэньваў сітуацыю капітан.— Можна было іх сюды і не прывозіць. У апорным пункце склалі б акт. І — трыццаць рублёў з носа. Па новаму закону!

— За што-о?! — усхапіўся са стула Сяргей.

— За распіццё спіртных напіткаў у грамадскім месцы,— удакладніў адзін з міліцыянераў-яршоў.— І непадпарадкаванне нам. Супраціўленне аказвалі? Аказвалі. Упіраліся? Факт... Усімі нагамі і рагамі. Таму можна і па другім артыкуле вас афармляць. Правільна я кажу, таварыш капітан?

— Правільна, ды не зусім,— начальнік узяўся за ручку і схіліўся над сталом.—Хопіць з іх і трыццаці рублёў. На работу паведамім. Няхай там іх прапясочаць... Ух, прапясочаць! Вазьму на кантроль. Прагрэсівачка лясне, трынаццатая зарплата, чарга на кватэру...

Сяргей не вытрымаў зноў:

— Мы будзем скардзіцца... Пракурору!

Капітан усміхнуўся.

— Ваш пракурор учора сам папаўся. Мае хлопцы высачылі... Ладна, не будзем цягнуць ката за хвост. Складаем акт — і па дамах. Да сваіх жонак. І запішыце, хлопцы, сабе на лбе: не мы законы выдумляем. Мы іх толькі выконваем. І, як бачыце, выконваем нядрэнна. Ваша прозвішча?.. Імя?.. Імя па бацьку?..

***

Апынуўшыся на вуліцы, Сяргей з Раманам адразу заявілі, што яны «клалі болт» і на дурны Указ, і на розныя там паведамленні на работу з выцвярэзніка. Кватэры ў іх былі. Партрэты на Дощцы гонару іх не віселі, з прафсаюза не выганяюць... Трынаццатай зарплаты, безумоўна, шкада, але што зробіш. А можа, яшчэ прыслухаецца заводскае начальства да іх тлумачэнняў, разбярэцца. Ну ў чым жа вінаватыя! Піва на вуліцы выпілі... Смехатура!

А Валянцін прадчуваў бяду. Ён быў членам партыі.

Сакратар іх цэхавай партыйнай арганізацыі нездарма, відаць, на сходах, ды і ў размовах тэт-а-тэт папярэджваў, ад душы засцерагаў: глядзіце, хлопцы! Ні пры якіх абставінах у грамадскіх месцах не расслабляйцеся. Не збірайцеся ў кучу, не ўжывайце нічога такога ў адкрытую. Нават — піва! Лепш у спакойнай абстаноўцы, дома. Ці на дачы, у гаражы...

— А самае надзейнае — у сарціры! — жартаваў той-сёй.— Прысеў, як чалавек, і — налівай! Ці з гарла...

(Працяг будзе).

Мочакаменная хвароба

Абумоўлівае стварэнне камянёў ў ныроках і мачавым пузыры. Аб'ядноўвае каля 40 працэнтаў усіх уралагічных хвароб. Найбольш часта ёю хварэюць ва ўзросце 20—25 гадоў і больш, у мужчын крыху часцей.

Узнікненню мочакаменнай хваробы садзейнічаюць умовы сучаснага жыцця (гіпадынамія, якая дапускае парушэнне фосфарна-кальцыевага абмену), кліматычныя ўмовы, у якіх губляецца многа вадкасці праз скуру і лёгкія, недахват у арганізме вітамінаў А, В, Д. Вялікае значэнне мае спалучэнне розных умоў: уклад жыцця, харчаванне, нават асаблівасці глебы, пітной вады і інш.

Устаноўлена, што хранічнае запаленне нырак (хранічны піелянефрыт) бывае адной з прычын утварэння камянёў, калі парушаецца вывядзенне мачы і паражаецца тканка самой ныркі. У выніку парушаецца састаў мачы. У ёй з'яўляецца многа бактэрый слізі, якія змяняюць рэакцыю выдзялення. Растворныя ў мачы мінеральныя солі выпадаюць у асадак.

Пры парушэнні адтоку ў любым аддзеле мачавога тракта ствараюцца ўмовы для асаджэння крышталяў солі, размнажэння і росту любых бактэрый.

У некаторых выпадках развіццё мочакаменнай хваробы ў пяясніцы. Часта гэта здараецца пасля фізічных нагрузак, страсення, піцця. Боль вельмі моцны. Нярэдка ён суправаджаецца вазтімі. Паміж прыступамі адзначаецца тупы боль у пяясніцы з аднаго боку. У мачы часта выяўляецца кроў. У многіх выпадках болевы прыступ заканчваецца выхадам невялікага каменя ці пяску. Але не заўсёды. У некаторых людзей з вялікімі і каралападобнымі камянямі хвароба праяўляецца толькі тупымі болямі.

Невялікія камяні, якія засеялі ў мачаточніку, для ныркі больш небяспечныя, чым буйныя ў ныркавай лаханцы. Гэта таму, што яны парушаюць адток мачы. Запаленне ныркі можа прагрэсіраваць.

АКАЗАННЕ ДАПАМОГІ. Маленькія камяні нярэдка выходзяць з мачаточнікаў самі. Асабліва пасля прыёму лекавых сродкаў (цыстэналу, но-шпы, уралесану, баралгіну ці спазмалгону).

Найбольш мэтазгодна пачынаць дапамогу з цеплавых працэдур (прыкласці грэлку да пяясніцы, пасадзіць хворага ў гарачую ванну ў спалучэнні з прыёмам болесуцішальнага прэпарата). Калі пасля гэтых мер жаданы вынік не атрыманы, неабходна выклікаць «хутную дапамогу».

Міналай СЕВАСЦЬЯНАЎ,
кандыдат медыцынскіх навук.
г. Мінск.

АКЦЫЯНЕРНАЕ ТАВАРЫСТВА «БЕЛАГРАПРАМБІРЖА»

БЕЛАГРАПРАМБІРЖА МЕНСК

На таргах у пятніцу, 15 мая 1992 года, было прапанавана на продаж звыш 3 тысяч відаў тавараў на суму каля паўтара мільярда рублёў. Зарэгістравана 44 здзелкі на суму 22,4 мільёна рублёў.

Сярод прададзеных і купленых тавараў:

Назва тавару	Колькасць	Адзінка вымярэння	Цана за адзінку (рублёў)
Збожжа фуражнае і насеннае	2.195	тона	6.500—7.000
Ільнасемя фуражнае і насеннае	50	тона	7.700—10.000
Соевы шрот	80	тона	7.550
Цукар	20	тона	64.000
Крухмал бульбяны	1	тона	20.500
Спірт-сырэц з жыта	2.000	кг	55
Глазура шакаладная	250	кг	320
Пракладка галоўкі блока рухавіка А-41	50	шт.	9
Культыватар УСКМ 5,4	1	шт.	12.500
Прычэп аўтамабільны ГКБ-819-01, самазвал, г/п 5 тон	1	шт.	50.000
Капальнік-аднарэз Л-651	1	шт.	13.700
Шыны аўтамабільныя	15	шт.	4.000—4.500
Стартэры для аўтамабіляў розных марак	120	шт.	3.200—4.000
Кабель сілавы АПВГ 2×2,5	100.000	м	25
Блокі ФБС 24, 4, 6 т	100	м. куб.	536
Цыгарэты «Тэмп», «Флуераш», «Космас» (Кішынёўская фабрыка)	120.000	пачак	12—14.50

Напамінаем, што таргі праводзяцца штотыднёва па пятніцах, з 11.00 па адрасу: Мінск, вул. Казінца, 86, корпус 2. Рэгістрацыя ўдзельнікаў з 9.00. Даведкі па тэлефонах: 77-07-26, 77-01-37.

ЗАГАДКАВАЕ. НЕВЕРАГОДНАЕ. ФАНТАСТЫЧНАЕ

Магія маятніка

Ніхто — ні ваш сябар, ні калега, ні чыноўнік і ні мудрэц не ведае вас так добра, як вы самі. Але маятнік ладнасе вам тут шмат новага, часам нечаканага, бо адкрывае доступ да нашай «чорнай скрыні» — падсвядомасці.

Што такое маятнік? Невялікі грузік на шнурку (нітцы), які ў час работы з ім трымаюць паміж вялікім і ўказальным пальцамі. Робіцца ён з дрэва, металу, шкла, бакеліту, штучнага жэмчугу або янтару. Неабавязкова прымяняць каштоўныя матэрыялы. Гэта можа быць заручальны пярсцёнак, корак з уторкнутай іголкай, гузік. Маятнік падвешваецца на нітку, лёску, ланцужок або шнур даўжынёй каля дваццаці сантыметраў.

А цяпер — навошта ён патрэбны, ваш асабісты маятнік? З многіх сфер яго прымянення спынімся перш за ўсё на тым, што цікавіць літаральна кожнага, — здароўі. Сёння ў Францыі, напрыклад, больш як 2.500 урачоў актыўна выкарыстоўваюць маятнік у паўсядзённай медыцынскай практыцы. Але і сам хворы можа такім чынам выбраць сабе ўрача, экстрасенса. Трэба толькі напісаць прозвішча яго на лісце паперы, патрымаць над ім маятнік і спытаць: «Гэты ўрач (экстрасенс) дапаможа мне?» Нарэшце, вы і самі можаце лячыцца з дапамогай маятніка. Французскі інжынер Андрэ Сіментон выкарыстаў яго для складання дыеты, каб пазбавіцца ад цяжкага захворвання — туберкулёзу. Для гэтага ён трымаў маятнік над назвай кожнай стравы і пытаў, ці варта яе ўжываць. Вярчэнне па гадзіннікавай стрэлцы ўказвала, што варта, супраць — не. Такім чынам ён не толькі вылечыўся ад туберкулёзу, але і ад захворвання печані.

Гэтак жа можна правяраць якасць ежы або вады, хатняя расліны — ці не шкодныя яны вам? — і многае іншае. Скажам больш: гэта незаменны дарадчык і ў вырашэнні іншых жыццёва важных праблем. З дапамогай маятніка можна вызначыць сваю будучую работу, спецыяльнасць, род заняткаў. Трэба напісаць спіс розных прафесій і над кожнай назвай патрымаць маятнік, пытаючыся: «Ці падыходзіць мне гэта прафесія?»

А ці ж не цікава даведацца пра сваю сумяшчальнасць з роднымі, сябрамі, саслужыўцамі? Тут трэба дзейнічаць наступным чынам. Інтэнсіўна падумайце пра чалавека, настройцеся на яго. Затым вазьміце ліст паперы і напішыце побач два прозвішчы людзей, якія вас цікавяць. Зрабіце глыбокі ўдых, расслабцеся, патрымайце маятнік над кожным прозвішчам, пытаючыся, ці падыходзяць вам гэтыя два чалавекі. Калі маятнік акрэсліць круг па гадзіннікавай стрэлцы, то адказ станоўчы, калі супраць — адмоўны. (Дарэчы, нельга жаніцца, выходзіць замуж, калі адзін з партнёраў заражаны станоўча, а другі — адмоўна. А зарад вызначаецца па верхняй частцы цела, дзе знаходзяцца галоўныя органы — сэрца, мозг. Патрымайце маятнік каля галавы. Калі ён пайшоў па гадзіннікавай стрэлцы — чалавек зараджаны станоўча. Ніжняя частка цела нясе процілеглы зарад).

Вы заінтрыгаваны, чытач? Або ўжо гатовы абвінаваціць аўтара кнігі, а заадно і рэдакцыю ў шарлатанстве? Значыць, самы час растлумачыць сакрэт гэтага няхітрага прыбора, які адказвае на любыя — і простыя, і складаныя — пытанні.

Мы жывём у энергетычным Сусвеце, і кожны арганізм акружаны патокамі энергіі, якую выпраменьваюць целы. Усе расліннымі і жывёльныя клеткі здольныя адчуваць і вызначаць існуючыя энергіі. Але гэта інтуіцыя ў ходзе развіцця чалавека была выцеснена розумам. Таму інтуіцыю яму трэба развіваць нанава. Большасць з нас навучыліся ўспрымаць энергію Сусвету, а маятнік дае магчымасць навучыцца ёю карыстацца. Чалавек, які мае здольнасць да ўспрымання энергіі, павінен толькі падумаць над дакладным пытаннем або праблемай, і яго мозг пашле промні ў бясконцасць, каб атрымаць пажаданую інфармацыю. І не сам маятнік дае адказы на пастаўленыя пытанні, а наш унутраны стан, заключаны ў нервовай сістэме. Маятнік толькі ўзмацняе гэтыя сігналы і іх сэнс перадае кодам—пасрэднікам паміж свядомасцю і падсвядомасцю. Аўтары кнігі сцвярджаюць нават, што маятнік — гэта пасрэднік паміж касмічным выпраменьваннем і падсвядомасцю. А характар яго руху, які адлюстроўвае «так» або «не», вызначаецца тым, што ён паказвае станоўчую або адмоўную энергію.

Як працаваць з маятнікам? Вызначце для сябе яго рух, які азначае «так» або «не», «магчыма». На такі від адказаў запраграмавана падсвядомасць. Пераканайцеся, што ў час маніпуляцый вы спакойныя, вашы пачуцці стабільныя. У процілеглым выпадку адказы маятніка будуць памылковымі, бо ён працуе па біяэлектрычных законах, вельмі ўспрымальны да душэўнага стану, які можа блакіраваць паток энергіі. Не дапускайце «замыкання», гэта значыць не скрыжоўвайце рук, ног. Ногі паставце цвёрда на падлогу. Маятнік трымайце толькі ў правай руцэ, паміж вялікім і ўказальным пальцамі. І яшчэ адна парада: працуйце заўсёды толькі з асабістым маятнікам. Ён настройваецца на вашы хістанні і ў руках іншага чалавека страчвае адчувальнасць. Удачы вам!

Пераклад І. МАРОЗАВАЙ.
З кнігі Г. Нільсана і І. Палянскага «Магія маятніка». (ФРГ).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

21 мая

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Я крочу па Маскве». Маст. фільм.
10.05. «Паэма душы». Мастак Элеанора Сямёнава.
16.30. Навіны.
16.35. Выяўленчае мастацтва. 4 клас. Віды і жанры выяўленчага мастацтва.
16.55. «Два клёны». Мультфільм.
17.30. Для выпускнікоў школ. Асабісты погляд. Працаўладкаванне пасля школы.
18.00. Дабрачынны канцэрт культурна-асветніцкага цэнтра беларускай суполкі інвалідаў па зроку. 2-е аддзяленне.
19.00. Абласныя навіны (Гродна).
19.10. Зачытайце маё пісьмо...
19.15. «Лясная быль». Частка 1-я.
19.35. Беларусь на міжнароднай арэне. Прымаюць удзел міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь П. К. Краўчанка і старшыня Дзяржаўнага Камітэта на знешнееканамічных сувязях У. В. Радкевіч.
20.20. Тыдзень беларускага ўрада.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Студыя «Сэнс» у Слонімскім раёне.
22.55. НІКа.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Казка пра пеўніка і прыгожую прынцэсу», «Дзень цудоўны». Мультфільмы.
8.00. Эстрадны спектакль «Дурні мы ўсе» з удзелам Я. Петрасяна.
9.55. Навукова-папулярны фільм «Горад адкрытых дзвярэй».
10.35. Выступае Камчацкі камерны аркестр.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Спорт для ўсіх.
11.55. «Маё жыццё — музыка». (Да 85-годдзя дырыжора К. Іванова).
12.50. Авіякасмічны салон.
13.15. Тэлемікст.
14.00. Навіны.
14.20. «Партрэт». Дак. фільм.
14.50. «Хамелеон». Маст. фільм. 1-я серыя.
16.00. Мультфільм «Сонны камень». 3-я і 4-я серыі (Англія).
17.00. Навіны.
17.25. «Сам-насам з прыродай». Мультфільм.
17.30. ...Да 16 і старэйшым.
18.10. Маст. фільм «Вачамі сведкі» (Англія).
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Мастацка-публіцыстычны фільм «Чалавек на ўсе часы».
21.35. Хіт-парад «Астанкіна».
22.50. Мультфільм для дарослых.
23.00. Навіны.
23.25. Музыка ў эфіры. Выбранае.
0.10. Кікбаксінг. Чэмпіянат свету сярод прафесіяналаў.
1.10. «Усяго шасць струн». Фільм-канцэрт.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.25. Іспанская мова. 1-ы год навучання.
7.55. Вольны час. «Увага: здымаю!
8.10. Іспанская мова. 2-гі год навучання.
8.40. Без рэтушы.
9.35. Памяці А. Д. Сахарава. «Вялікая хартыя вольнасцей».
10.35. «Джынджэр і Фрэд». Маст. фільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. «Дзіцячыя мары». Шматсерыйны фільм (Францыя). 3-я серыя.
15.35. Шэдэўры еўрапейскай музыкі з храма святога Францыска Асізскага.
16.15. Ключ да сусветнага рынку.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Паны-таварышы.
17.15. Расія і свет.
17.45. Экспацэнтр прадстаўляе...
18.00. Парламенцкі веснік.
18.15. Студыя «Нотабене».
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спецыяльны камерцыйны веснік.
19.40. «Санта-Барбара». 47-я серыя.
20.30. Хрона. У свеце аўта- і мотаспорту.
21.00. Пятае кола.
22.00. Весткі.
22.25. Спартыўная карусель.
22.30. На сесіі ВС Расіі.
23.00. Пятае кола (працяг).

22 мая

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Сем азёраў». Кінанарыс.
9.00. Выяўленчае мастацтва. 4 клас. Віды і жанры выяўленчага мастацтва.
9.20. «Сем старых і адна дзяўчына». Маст. фільм.
16.30. Навіны.
16.35. «Тапчумба», «Жыла-была пчолка», «Казка пра храбрага зайца», «Дадабай і будзільнік». Мультфільмы.
17.20. Наша школа — нашы старты. Эксперыментальная ДЮСШ № 18 г. Мінска.
18.00. Дак. фільмы «Дакрананне», «Экспазіцыя».
19.00. Абласныя навіны (Магілёў).
19.10. Наш каментарый. «Піястры, піястры...»
19.15. Банк і рэформа. Пра дзейнасць Белаграпрамбанка.
19.45. «Лясная быль». Частка 2-я.
20.05. Беларускі агратэхнічны універсітэт: праблемы і перспектывы развіцця.
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.40. «Сем старых і адна дзяўчына». Маст. фільм.
23.00. НІКа.
23.15. Паказвае Гродна. «Вячэрні канал». Інфармацыйна-музычная праграма.

І канал. Астанкіна

5.00. Раніца.
7.35. «Залатая антылопа». Мультфільм.
8.05. Фільм — дзецям. «Песні для Ўнукаў».
9.05. ...Да 16 і старэйшым.
9.55. «Рубаі Хаяма». Фільм-балет.
11.00. Навіны (з сурдаперакладам).
11.25. Клуб падарожнікаў (з сурдаперакладам).
12.15. Іграе інструментальны ансамбль «Куток Расіі».
12.30. Навукова-папулярны фільм «Цені ў лесе» (Англія).
13.20. Брыдж.
13.45. Бізнес-клас.
14.00. Навіны.
14.25. «Па той бок рампы з усмешкай». К. Лучко.
14.45. «Хамелеон». Маст. фільм. 2-я серыя.
15.50. «Газавае супольніцтва ў абноўленай Еўропе».
16.00. Мультфільм «Сонны камень». 5-я і 6-я серыі (Англія).
17.00. Навіны.
17.20. Чалавек і закон.
18.00. Тэлекампанія «Астанкіна» прадстаўляе праграмы «Сентрал тэлевіжн» (Англія). «Проста нармальная дзяўчынка». Маст. фільм; «Вяселле бурага мядзведзя». Мультфільм.
18.50. «Поле цудаў».
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. «ВІД» прадстаўляе: «Токшоў», «Музагляд», «АнтыСНІД», «Шоў-біржа», Пляцоўка «Агляду».
У перапынку (23.00) — Навіны.
0.15. «Ранішняя зорка» ў начным эфіры.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Час дзелавых людзей.
8.20. Англійская мова. 1-ы год навучання.
8.50. «Дамашні клуб».
9.05. Англійская мова. 2-гі год навучання.
9.35. Вячэрні салон.
12.15. «Лотас». Тэлефільм.
12.40. Сялянскае пытанне.
13.00. Весткі.
15.00. Там-там-навіны.
15.15. Першы тайм.
15.30. Фальклор. «Сусветная вёска».
16.15. Прастора плюс.
16.45. Т. Ін. Ка.
17.00. Непазнаны Сусвет.
17.45. М-трэст.
18.00. Экран крымінальных паведамленняў.
18.10. Белая варона.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Паралелі. Відэафільм пра стары Пецярбург «Развітанне».
20.00. «Артабстрэл».
20.55. На сесіі ВС Расіі.
21.25. «К-2» прадстаўляе: «Каронка», «САС», «3, 2, 1» і маст. фільм «Доўгае шчаслівае жыццё».

РАДЫЁ

22 мая

Апошнія паведамленні: 6.00, 7.00, 10.00, 15.00, 20.00, 23.00.

7.00 — «Радыёфакт». 8.05 — «Дзелавы кур'ер». 8.15—«Вясковыя рэпарты». 9.15—Я, Пушча. «З зямлёй навекі знітаваны». Радыёкампазіцыя. 10.15 — А. Вольскі. «Тры Іваны — тры браты». Радыёкампазіцыя. Частка 2-я, заключная. 11.20—«Саветы: улада і справы». 12.00 — «Апоўдні». 13.00—«У абедзенны перапынак». 14.00 — новыя музычныя запісы радыёфанатэкі. 15.15—«З намі музыка». Народныя мелодыі. 16.05—«Хто ў доме гаспадар?». Перадача для школьнікаў. 17.00 — канцэртная праграма. 18.00 — перадачы абласнога радыё. 19.00 — гуманітарна-інфармацыйны канал радыёстанцыі «Беларуская маладзёжная». 19.45—вячэрняя казка. 20.00—«Дзень нашага жыцця». 20.40 — «Машэрава, 21». Прафсаюзны веснік. 21.00—музычная праграма па пісьмах радыёслухачоў. 23.10 — канцэрт. 0.00—«Начны канал».

НА ДВОР'Е

21 мая

Сёння ўдзень па рэспубліцы пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ў Віцебску — 17—19, Магілёве — 19—21, Гомелі —20—22, Мінску—21—23, Гродна — 22—24, Брэсце — 23—25.

У наступныя двое сутак па рэспубліцы пераменная воблачнасць, пераважна без ападкаў, толькі 22-га месцамі кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра 22-га ўначы — 5—10, удзень — 12—17, па паўднёваму заходу — 20—25, 23-га ўначы — 1—6, па поўначы замаразкі да нуль — мінус 3, удзень — 13—18 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

СОВЕТСКАЯ БЕЛОРУССИЯ
СЁННЯ Ў НУМАРЫ

У Прэзідыуме Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Знаходжанне ў Мінску Прэзідэнта Фінляндскай Рэспублікі Маўна Хенрыка Койвіста.

«З самых—самыя». Да вынікаў конкурсу «Педагог года-92».

«Апошні бастыён або лыка ў строчку». Лёгкую прамысловасць рэспублікі яшчэ можна выратаваць...

«Страх перад страхаваннем». З 1 студзеня 1993 года ў Расіі ўводзіцца Закон аб медыцынскім страхаванні. Як у гэтым плане абстаяць справы ў Беларусі?

Чытаючы зводкі Дзяржкамстата «Ад «хрушчоўак» да «чарнобыльскіх катэджаў».

Чытач — чытачу. Падборка пісьмаў.

«Свет сучасніцы». Сям'я, работа, адпачынак.

Рэклама, аб'явы

ПРАДПРЫЕМСТВА ПРАДАЕ СА СКЛАДА Ў МІНСКУ:

мікраўтобусы РАФ-2203-01,
пасудамыечныя машыны МБП-86 «Нямігa»,
кухонныя камбайны «Страуме-3».
Даведкі па тэл. 39-52-07, 26-65-86, 59-61-97.

МЯНЯЮ ў г. Чэбаркуль 2-пакаёвую кватэру 30,2 кв. м з усімі выгодамі, 3-ці паверх, пакоі ізаляваныя (побач райсэнтр) на раўнацэнную ў Магілёве, Мінску, Бабруйску і бліжэйшых да іх раёнаў Беларусі.

Звяртацца:

456400, г. Чэбаркуль Чэлябінскай вобл., вул. Кашырына, 36,